
Расправа ў Шпаках ☞ 3

# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ЛЯВОН ТАРАСЭВІЧ ☞ 5



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 5 (2542) Год L | Беласток, 30 студзеня 2005 г. | Цана 2,00 зл.


*Д. Данялюк: З'яўляемся адзінай крыніцай інфармацыі пра Беларусь для польскіх журналістаў...*

## Партал пра беларускае

**Зараз адзіным месцам у Польшчы, дзе можна знайсці інфармацыю пра падзеі на Беларусі ды сярод беларускай меншасці ў Польшчы, з'яўляецца інфармацыйны партал www.bialorus.pl. Сайт адыгрывае вялікую ролю ў падтрымцы незалежнай палітычнай беларускай журналістыкі, а таксама ў даступны спосаб інфармуе пра культуру ды эканоміку Рэспублікі Беларусь. Размаўляю з каардынатарам праекта Дарыюшам ДАНЕЛЮКОМ:**

***— Самая важная справа ў такіх вялікіх праектах гэта мэты дзейнасці і спосабы іх рэалізацыі. Якія мэты ў сайта www.bialorus.pl?***


Дарыюш Данялюк

— Партал паўстаў у ліпені 2001 года. Узнік ён як адзін з праектаў Грамадзянскага цэнтра адукацыі Польшча-Беларусь. Нам хацелася стварыць інфармацыйны бюлетэнь. У ім мела знаходзіцца ўсялякая інфармацыя з Рэспублікі Беларусь. Вядома, важнай была інфармацыя пра беларусаў у Польшчы. З часам наш бюлетэнь ператварыўся ў нешта накшталт партала. Усё гэта таму, што было ўсё больш інфармацыі, ствараліся новыя рубрыкі: культура, эканоміка, адукацыя, ну і, вядома, палітыка.

***— Чатыры гады безупыннага існавання ў прасторы сеткі Інтэрнэт. Ці можна сказаць, што партал будзе яшчэ разрастацца?***

— Вядома, нам да дасканаласьці яшчэ дарога крутая. Будзем яго напэўна разбудоўваць, мы ў гэтым упэўненыя. Але так, як у большасьці няўрадавых арганізацыяў у Польшчы, і ў нас фінансавыя недахопы. З гэтае прычыны не можам зрабіць усяго, што нам марыцца. Паколькі нашы намеры былі такія, каб інфармаваць палякаў пра Беларусь, дык зараз нас таксама чытае многа жыхароў Беларусі і ўсяго свету. З'явілася патрэба стварыць англамоўны ды беларускамоўны варыянты сайта. Зараз плануем пашырыць інфармацыю пра беларусаў у Польшчы.




***— Афіцыйная інфармацыя беларускіх СМІ не заўсёды аб'ектыўная. Адкуль тады бярэце навіны для партала?***

— У галоўным з незалежных беларускіх інтэрнэт-выданняў. Многа інфармацыі атрымоўваем непасрэдна па электроннай пошце. Часта інфармуюць нас пра падзеі палітычныя групоўкі ды грамадскія арганізацыі. Глыбокай крыніцай навін для нас з'яўляецца Беларускае аб'яднанне журналістаў. Часта, карыстаючыся ўсімі гэтымі крыніцамі, ствараем уласныя інфармацыі. Стараемся таксама супрацоўнічаць непасрэдна з беларускімі журналістамі. Вядома, карыстаемся і афіцыйнай інфармацыяй, але напэўна стараемся выбіраць тое, што важнае. У дзень стараемся змясціць каля васемнаццаці навін. Дарогай селекцыі выбіраем самыя важныя.

***— Інтэрнэт гэта вельмі інтэрактыўнае асяроддзе. Як існаванне партала www.bialorus.pl ацэньваюць ягоныя карыстальнікі?***

— Атрымоўваем многа каментарыяў па электроннай пошце. У агульным гэта рознага тыпу заўвагі. Адны шукаюць кантактаў для супрацоўніцтва з беларускімі прадпрыемствамі ці арганізацыямі, іншым неабходная інфармацыя аб адпачынку, некаторыя просяць нас дапамагчы ў пошуках сваіх сем'яў. Адной з галін дзейнасці партала з'яўляецца падпіска на электронную рассылку навін. Зараз у нас пад 1 000 падпісчыкаў. Яны атрымоўваюць нашу інфармацыю кожны дзень.

***— А колькі разоў у дзень наведваюць вас інтэрнаўты ў пошуках інфармацыі?***

— Наш лічыльнік інфармуе, што наш сайт адкрываецца каля 300-400 разоў у дзень. Ад паўстання сайта нас адведалі больш за 160 тысяч разоў. У галоўным чытаюць нас студэнты, асобы звязаныя з адукацыяй — гісторыкі, палітолагі. Мяркуем таксама, што і польскія палітыкі шукаюць у нас інфармацыі пра Беларусь. Трэба сказаць, што з'яўляемся адзінай крыніцай, якой карыстаюцца польскія журналісты ў пошуках інфармацыі пра Беларусь.

***— Колькі чалавек стварае сайт?***

— У розны час па-рознаму гэта бывала. Зараз нас чатыры асобы. Дзве асобы рыхтуюць інфармацыю. Адна асоба займаецца арганізацыйным бокам праекта ды асочваннем беларускай тэматыкі ў польскіх СМІ. Маем таксама інфарматыка, які забяспечвае тэхнічны бок праекта. На сённяшні дзень гэта аптымальная колькасць асоб.

***— Трэба адзначыць, што партал не з'яўляецца камерцыйным праектам. Утрымоўваецца толькі і выключна з розных грантаў?***

— Так, партал існуе ў рамках дзейнасці Грамадзянскага цэнтра адукацыі Польшча-Беларусь. Грошы, якія патрэбны для існавання сайта, атрымоўваем ад спонсараў, таму ён бясплатны. Ёсць шанц, што дапамогуць нам у нейкай меры студэнты ў рамках стажыровак.

***— Паколькі сайт існуе, дык напэўна ёсць нейкія планы далейшага развою?***

— Зараз стараемся ўсё шчыльней супрацоўнічаць з „Нівай", хочам таксама „выпускаць" большую колькасць ньюсаў. Працы многа, на шчасце маем таксама многа новых думак. Асноўнай справай, якая зараз вынікае толькі і выключна з фінансавых недахопаў, гэта адсутнасць карэктуры. У выніку здараюцца нам моўныя і арфаграфічныя памылкі.

***— Дзякую за размову.***

**Гутарыў Лукаш Сцепанюк**

### *Картачка на Каляды* ☞ 2

Ганна Кандрацюк

*У Шчодры вечар я сустрэлася з сябрамі ў адным г.зв. культавым кафэ-бары ў цэнтры горада. Паненка за барам (родам з беларускай вёскі) на жаданне, каб уключыць беларускую музыку, адказала: Żadnych białoruskich i żydowskich pieśni nie będzie. Bo bedą może komuś przeszkadzać z gości...*

### *Дарогу маладым* ☞ 2

Віктар Сазонаў

*Савецкі Саюз сканаў. Разваліўся хутчэй, чым хтосьці мог чакаць. І спаквала пачала выяўляцца праўда. І пра тое, што было да вайны, і падчас яе, і пасля. І што ёсць ветэраны, якія пачалі ваяваць толькі ў пяцьдзесят трэцім годзе, знішчаючы ў Налібоцкай пушчы апошнія атрады тых, хто змагаўся за незалежную Беларусь...*

### *Усе калядуюць* ☞ 4

Аляксей Мароз

*— У маёй вёсцы Кнаразы раней хадзіла многа каляднікаў. Дзяўчаты заходзілі спяваць калядкі ў хаты, а хлопцы з гвяздамі славілі Хрыстовае нараджэнне пад вокнамі. Зараз занікае традыцыя калядавання. Спяваць калядкі прыязджаюць гарадскія ўнукі жыхароў вёсак, — заявіў жыхар Гайнаўкі Лявон Масальскі і пахваліў калядоўшчыкаў з дома культуры...*

### *Жыць са святымі* ☞ 8

*Парыж — вялізны мегаполіс, але на дзіва ўтульны і кампактны горад. Вельмі зручнае метро, якое ўражвае высокім тэхнічным роўнем, прыкладам 14-я лінія (Ліёнскі вакзал — Нацыянальная бібліятэка), дзе цягнікі кіруюцца электронікай. У горадзе, дзе такі інтэнсіўны рух, надзвычай чыстае паветра...*

### *Чужы я ўсюды* ☞ 9

Віктар Швед

*Дзмітры Шатыловіч — паэт надта сціплы ў сваёй творчасці, піша не зашмат і таму хацелася б прачытаць амаль усё, што выходзіць з-пад яго пяра. Ды тут крыху статыстыкі. Са складзеных паэтам у друк 62 вершаў у зборніку на 60 старонках паявілася толькі 35 вершаў. Для 27 твораў не знайшлося месца ў зборніку і гэта не таму, што не заслугоўваюць...*

### *Мара кантрабандыста* ☞ 10

Сымон Нальшанскі

*Аднаго дня я зразумеў, што мая мара набліжаецца да моманту рэалізацыі. Грошы на нейкі дробны бізнес ужо былі. І планы былі. Мяркую, з'езджу ў свой апошні кантрабандны паход, і хопіць з мяне. Пачну займацца выплатай сваёй дзяржаве падаткаў...*



# Картачка на Каляды

*Беласток. Другі дзень праваслаўных Каляд. У пад'ездзе, дзе жыву, раздаецца рой пнеўматычнага молата. Гляджу на гадзіннік — восьмая раніцы. Назойлівы грукат працягваецца яшчэ дзве гадзіны.*

*— Ciekawe, jak bym tak ja na katolickie święta wyskoczył z wiertarką? — не можа надзівавацца муж.*

*Я не здзіўляюся. Нішто і так не пераплюне Аўгустова! Вось, два гады таму, у першы і другі дзень праваслаўных Каляд рабочыя з Вышак вылівалі асфальт... Вуліцай прахозілі групы калядоўшчыкаў з гвяздамі. Жыхары Аўгустова, гонар якіх змяшалі з асфальтам, падагулілі ўсё адным словам:*

*— Біда!*

* * *

*А яшчэ ў першы дзень Каляд мне хацелася крычаць: Europo, witaj nam!*

*Дзень да Куцці ў магазінах панаваў нейкі зрух. Праўда, дасвяточную мітусню хутчэй справакавалі ўсялякія прамоцыі і распродаж тавараў (у некаторых магазінах віднелі аб'явы на рускай мове). Хоць сярод кліентаў вылучаліся артадоксы. Куплялі падарункі, таўпіліся побач прылаўка са свежай рыбай, пячэннем. Гандлёўцы па-рознаму адносіліся да пакупнікоў, хоць сустракаліся праблiскі талерантнасці. У модным магазіне „Max Junior" ішлі ўсё яшчэ калядкі.*

*Раніцай 6 студзеня на базары што па Юравецкай стаяла чарга па жывога карпа. Прадаваліся свежыя елкі. Палова крамаў зусім не працавала. На „рускай" частцы рынку, цалкам як на каталіцкае свята, не было жывой душы. Я ішла вуліцай і лавіла характэрны пах посных страў. Было яшчэ цёмна і зусім пуста, і мне хацелася думаць, што сёння выхадны дзень.*

*На Каляды таксама нешта змянілася... Вечарам на вуліцах Беластока панавала ціш, як у час футбольных матчаў. У вокнах зіхацелі каляровыя ёлкі. Шпацыравалі апранутыя па-святочнаму пары. Каля маёй хаты быў закрыты вялікі магазін (што нават мяне ўцешыла). Вечарам там і сям чуліся „Маланкі", „Асы", „Прымакі".*

*Ад радасці і цудоўнай перамены мне хацелася ўперамешку і спяваць, і плакаць. Настрой раўнаважыла Беластоцкае тэлебачанне. Вось, напрыклад, журналісты рэгіянальных „Навінаў" як сенсацыю палічылі... менавіта звычайнае святкаванне. Тэмай дня сталі таемныя картачкі, якія, паводле беластоцкіх тележурналістаў, залілі ў гэтыя дні ахову здароўя. На іх паведамлялася, што 6 і 7 студзеня кабінет такі і такі не працуе. Тэлежурналісты ні словам не згадалі пра канстытуцыйнае права на святкаванне... Затое паказалі абураных пацыентаў. Што за парадкі, паны?! Прыходзіць такая старэча да лекара — а тут нейкая картачка вісіць! Пад канец „Навін" была нават нейкая інфармацыя пра праваслаўныя Каляды. Толькі без ніякіх сувязей з картачкамі на дзвярах лекарскіх кабінетаў.*

*Словам, як сказалі б у Аўгустове: Біда!*

*Я таксама перажыла шок ад пэўнай картачкі. Ужо пасля Каляд, на Гагатуху. Мой шок быў пазітыўны (бо бачу такое першы раз за 11 гадоў жыцця ў многіх кварталах Беластока). Менавіта: клуб „Міраж" запрашаў на наваўгоднюю танцавальную вечарыну ўсіх паклоннікаў беларускай, украінскай і рускай музыкі... Гэта звычайныя картачкі, але яны вісяць яшчэ па сённяшні дзень у суседніх пад'ездах. Сваю я ўзяла на добрую памятку.*

*Добра, што з'яўляюцца праблiскі талерантнасці, нават калі гэта справа арганізаванасці. У Шчодры вечар мне прыйшлося пазмагацца з беластоцкім стандартам. Я сустрэлася з сябрамі ў адным г.зв. культавым кафэ-бары ў цэнтры горада. Паненка за барам (родам з беларускай вёскі) на жаданне, каб уключыць беларускую музыку, адказала: Żadnych białoruskich i żydowskich pieśni nie będzie. Bo bedą może komuś przeszkadzać z gości...*

*Мы патрабавалі сустрэчы з самім шэфам. А гэты не толькі пусціў беларускую музыку, але і сам танчыў да белага рання, паўтараючы: Ja bardzo lubię białoruskie piosenki.*

**Ганна Кандрацюк**

# Дарогу маладым



*У Савецкім Саюзе не было рэкламы. Ды і навошта яна патрэбная, калі не было чаго рэкламаваць. Усё было дэфіцытам. Калі ты хоць нешта ўбачыў у краме, то адразу купляй. Ці як тады гаварылі: „бяры". Бо як не возьмеш зараз, то не возьмеш ніколі. Першы ж наведнік гэтай крамы забярэ ўсё што там ёсць. Затое ў рэкламаванні савецкага ладу жыцця недахопу не было. Газеты, тэлебачанне, афіцыйныя выступы, школьныя заняткі і нават песні — усё было падпарадкавана прапагандзе „нашага" „найлепшага" „палітычнага" „выбару". Мы выраслі пад маршы і гімны, і з першага класа спявалі песні пра тое, што „молодым везде у нас дорога, старикам везде у нас почёт". Праўда, ужо тады, гледзячы на згорбленыя спіны вясковых бабулек на праполцы буракоў або ў баразне з бульбай, мы пачыналі сумнявацца, ці можна гэтыя позы лічыць „почётными". Але прапагандыцкая машына не давала доўга сумнявацца. Недзе там, думалі мы, там дзе сярод белых капіталістаў жывуць цёмнаскурыя няшчасныя працоўныя — намнога горш. Так сцвярджала „наша" прапаганда.*

*Што тычыцца старых, якім у нас быў паўсюдна „почёт", я задумаўся як убачыў здымкі ў школьным музеі ветэранаў вайны. Маіх дзядоў там не было. А ў нашай хаце, на палічцы з кнігамі ляжалі дзедавы ўзнагароды за геройства, выяўленае ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Я спытаў дзеда, чаму на нашу хату не прыбілі зорку, якая сведчыць, што тут жыве ветэран вайны. Дзед толькі ўсміхнуўся:*

*— Ведаў бы ты ўнучак як размяркоўваліся зоркі там, на фронце, то такога не пытаўся б.*

*Другі мой дзед на такое пытанне адказаў яшчэ больш таямніча:*

*— Бабка таксама мае медаль, за працу ў калгасе. Бачыў, з Ленінам такім, як на савецкім металічным рублі. Хопіць нам і гэтай „пашаны". Хоць лепш бы нам тады далі не медаль, а рубель, бо зусім грошай не было. Ні капейкі. А за працу нам палачкі ў калгаснай кніжцы ставілі.*

*Савецкі Саюз сканаў. Развалійся хутчэй, чым хтосьці мог чакаць. І спаквала пачала выяўляцца праўда. І пра тое, што было да вайны, і падчас яе, і пасля. І што ёсць ветэраны, якія пачалі ваяваць толькі ў пяцьдзесят трэцім годзе, знішчаючы ў Налібоцкай пушчы апошнія атрады тых, хто змагаўся за незалежную Беларусь. І што мноства сапраўдных змагароў супраць фашызму так нічога і не атрымалі, акрамя медаля і палачак за „трудодни". І што вялікая колькасць беларусаў паспелі паваяваць за ўсіх у гэты час. Акрамя як за сябе. І ў польскае войска іх бралі, і ў савецкае. Ды і немцы аб'яўлялі прымусовыя наборы. А беларусу, як зрэшты і ўсім людзям на свеце, хацелася змагацца за сваё. Толькі як разабрацца, дзе яно, сваё.*

*Савецкі Саюз сканаў. А на яго падмурках узніклі маладыя краіны, якія мусілі вызначыцца, як ім будаваць сваю гаспадарку. На рэкламе прадукцыі, ці на прапагандзе ідэалогіі. Што паставіць наперад. Воз ці каня. І на чым будаваць сваю прапаганду.*

*У Беларусі сёння не сталі ламаць галаву над нечым новым. Прапаганда старая. Яшчэ савецкая — маладым усюды адкрытыя шляхі, старым паўсюдная павага. Ветэранаў шануюць. Ёсць загад вырашыць усе іх сацыяльныя праблемы. Добра, калі гэты загад дойдзе і да тых ветэранаў, у якіх медалі на кніжнай палічцы, а на хаце так ніхто ніколі і не прымайстраваў зорку. Заслужылі на павагу ўсе. Гэта нармальная з'ява для кожнай краіны. А вось якім маладым адкрытыя шляхі?*

*На мінулым тыдні мы пра такіх пачулі. Замяняючы кіраўніцтва Камітэта дзяржаўнай бяспекі, кіраўнік дзяржавы зрабіў стаўку на маладых. Такая масавая замена ў вышэйшых шэрагах самай патаемнай дзяржаўнай структуры не можа не заінтрыгаваць. Звычайна такія замены робяцца толькі тады, калі краіна кардынальна мяняе свой палітычны курс. Калі трэба абаперціся на нейкія новыя, маладыя палітычныя сілы зусім іншага кірунку, чым быў раней. І ці ведаюць маладыя новыя кіраўнікі што ад іх патрабуюць? І ці ведае той, хто патрабуе, чаго ён хоча? Бо на адной з апошніх нарадаў кіраўнік дзяржавы запатрабаваў ад падначаленых знайсці альтэрнатыўныя крыніцы энерганосьбітаў. З Расіяй, маўляў, адкуль энергія імпартавалася, не зусім партнёрскія сувязі. І вінаватыя ў гэтым якраз расійскія палітыкі. Адным словам, гаварылася так, як некалі, гадоў дзесяць таму гаварыла апазіцыя. Цікава якой думкі наконт гэтага ўсяго „маладыя"?*

**Віктар Сазонаў**

---

**Вачыма еўрапейца**

# Балела яму Беларусь



*— Я хацеў бы, каб беларусы ў Польшчы адчувалі, што ёсць у іх аднолькавыя шанцы, як і ў палякаў, рабіць кар'еру. Каб з уласнай моваю, культурай і традыцыяй атоесамляліся з гэтай краінай. Чым больш лібералізму для меншасцей, тым лепш для Польшчы, — так гаварыў у кастрычніку 2002 года ў Беластоку Ян Новак-Езяранскі. 21 студзеня 2005 г. Польшчу і ўвесь дэмакратычны свет усхвалявала вестка аб ягонай смерці. Споўнілася яму 92 гады.*

*У сапраўднасці называўся ён Здзіслаў Езяранскі. Ян Новак гэта ягоны псеўданім з часу акупацыі і перыяду, калі быў кур'ерам Арміі Краёвай у Лондане. Чвэрць стагоддзя шэфстваваў польскай секцыі Радыё Вольная Еўропа. Пасля вяртання на пастаяннае жыхарства ў Польшчу ў 1992 г. раз наведаў Падляшша і Беласток. Не скрываў таго, што галоўнай мэтай прыезду была сустрэча з польскім асяроддзем беларускай грамадскасці. Зацікаўлены беларускай праблематыкай, распытваў, у чым і як можа дапамачы. Чакаў спіску ў пунктах незавершаных спраў, якія маглі б стаць крыніцай польска-беларускіх канфліктаў. Прытым падкрэсліваў:*

*— Палякі павінны як найдалей ісці поплеч беларусаў у справах увекавечвання месцаў іх памяці.*

*Адназначна тады падтрымаў беларусаў, якія самастойна стартавалі ў самаўрадавых выбарах (Беларускі выбарчы камітэт). Нават пазіраваў да здымка, пацiскаючы руку кандыдата ББК на прэзідэнта Беластока Антона Міраловіча.*

*Ужо тады гучна выказваўся з Беластока аб неабходнасці аднаўлення Радыё Рацыя, свайго роду Радыё Вольная Еўропа для Беларусі.*

*— Радыёстанцыя павінна паралельна весці навучанне беларускай мове, — зазначыў.*

*Беларусь яму „балела".*

*— Няма лепшага спосабу на кансалідацыю грамадства з уладай, чым ізаляцыя. Польшча не павінна ўключацца ў крыжовы паход, хоць Лукашэнка — не дэмакрат.*

*На два месяцы да смерці, перад канчатковым вынікам прэзідэнцкіх выбараў на Украіне, у Калегіуме Усходняй Еўропы адважыўся паставіць такі тэзіс:*

*— Актыўная палітыка ў адносінах да Беларусі і Украіны павінна стаць для Польшчы стратэгічным прыярытэтам. Прадпамерана, пераліčваючы абедзве гэтыя краіны, на першым месцы стаўлю Беларусь, а не Украіну. Па-першае таму, што тое, што засталося ад непадлегласці Беларусі, здаецца мне стаяць пад большай пагрозай. Сярод краін, якія вылучыліся пасля распаду СССР, Беларусь —найслабейшае звяно, адзіная краіна, якой кіруюць у даўнім дэспатычным стылі былыя савецкія партыйныя бюракраты.*

*Далей дадаваў, быццам спасылаючыся на свае думкі, агучаныя два гады раней у Беластоку:*

*— Сёння, апрача гаспадарчага ўбоства, найбольшай унутранай крыніцай пагрозы для Беларусі з'яўляецца недахоп этнічнай тоеснасці значнай часткі грамадства [...]. Лукашэнка кіруе Беларуссю аўтарытарным спосабам, не дапускаючы апазіцыю да ўлады. Аднак гэта не ёсць яшчэ герметычны таталітарызм. Застаецца яшчэ акрай свабоды — мабыць, падобны да таго, які існаваў у Польшчы ў часы Герка.*

*Выпадкова некалькі гадзін пасля смерці Яна Новака-Езяранскага, у польскім Сейме адбылася дэбата на тэму сёлетняй замежнай палітыкі. Беларусь засталася на яе далёкіх палях, хоць дэпутаты хвіліну раней аказалі пашану чалавеку, які — як гэта назваў у іншым месцы былы шэф МЗС Уладыслаў Барташэўскі і сябра Здзіслава Езянскага — быў голасам свабоднай Польшчы. Але і свабоднай Беларусі і Украіны. Якраз у такой чарзе.*

**Мацей Халадоўскі**

# Падляшская варфаламееўская ноч*

Канцавізну нападалі шэсць разоў летам 1945 года. Першы раз прыйшлі ўвечар недзе ў маі-чэрвені. Забілі тады аднаго хлопца, што пайшоў працаваць у міліцыю. І яшчэ аднаго шукалі, але не знайшлі. За першым разам нічога не рабавалі, а пазней забіралі тое, што лепшае. А калі што было прыхавана, тады бралі тое, што папала. Аднойчы я бульбу з парніка высыпала, а на яе месца кажух укінула. Забралі ад мяне ўсё, што ад мужа засталося. Ежы не патрабавалі выдаваць, толькі бралі тую, што была пад рукою:

— Мы толькі хлеба і нешта да хлеба.

І дабытку не забіралі. Аднаго разу каня запрэглі, але той конь ім не спадабаўся, то і не ўзялі. Ды і вупраж нашы хавалі.

2 лютага 1946 года прыйшлі ў сёмы раз. Ужо настала шэрань, у хатах пазапальвалі лямпы. У вёсцы варта быццам была, але яны ў той вечар сядзелі ў нас і ў карты гулялі. Я пачула выстралы, глянула ў акно — стадола наша гарыць! І карцёжнікі кінуліся кожны ў свой бок, сваю жывёлу выпускаць. Адзін ад страху не мог хлява адчыніць і яму ўся жывёла згарэла. І яшчэ ў аднаго, каталіка, што жыў у канцы вёскі, уся жывіна спалілася; мабыць, злачынцы былі недаінфармаваны. А іншыя вяскоўцы павыганялі дабытак; мо і ў іх нешта прапала, але пра гэта пасля не згадвалася. Да людзей не стралялі. Нашы хатнія кінуліся на поўнач, да гасцінца, а я двойку сваіх дзяцей у падвал занесла. Наша хата была адзіная пад саламянаю страхою, але яе не падпалілі; уцалелі нашы хата і хлеў, а стадола і свіран згарэлі. У стадоле было схавана шмат дабра і брат прабаваў яго ратаваць, але яшчэ бегалі разбойнікі і брат уцёк.

Ад пажару ўцалела мо 5-6 жылых дамоў, і не ўсе гаспадарчыя збудаванні згарэлі. На другі дзень усе з вёскі паўцякалі да сваякоў, асталіся адно старэчы. Мой брат, у якога я жыла, падаўся да цесцяў у Кажаны, мама пайшла да свайго брата. Мяне мая цешча ў Сураж забрала, але я штодзень прыходзіла ў Канцавізну свіней карміць, а пасля двух тыдняў, на свае Грамніцы, вярнулася. Сын, які ўжо чуў пра спаленне Вулькі-Выганоўскай, пытаў мяне:

— Ці нас таксама ў стадоле падпаляць?

— Не, — адказвала я яму.

Мая дваюрадная сястра была ў той вечар на забаве і пасля гаварыла, што бачылі тры пажары запар; гэта гарэлі яшчэ Шпакі і Зані.

Гаварылі, што ў той дзень у нашай вёсцы быў нейкі чалавек, які нашых мужчын частаваў гарэлкай: каб паўпіваліся, каб не маглі бараніцца...

У Завыках-Ферме ў той вечар забілі аднаго чалавека, але Фермы не палілі. Нейкі час раней двух мужчын з Фермы вярталіся на падводзе з Беластока. У Завыках іх запынілі, распранулі і голымі адпусцілі. Адзін з іх на другі дзень пайшоў шукаць каня з возам і больш яго ўжо ніхто не бачыў.

Пасля пажару Канцавізны, пакуль яшчэ трымаў лёд на Нарве, нашы мужчыны ездзілі на шляхту, у Фалькі ці Філіпы, і куплялі там таўсцейшую драўніну для будынкаў. Ад дзяржавы ніякай дапамогі не атрымалі, адбудоўваліся за свой кошт.

* * *

У Шпаках ужо вечар быў. Я быў у дзедка і бабулі, была там яшчэ і мая цётка. Дзедка вярнуўся з Буйнова ад бабулінага брата, прывёз мне малако.

Ехалі жалезнякамі ад Малешаў. У хату ўвайшло трох ці чатырох у мундзірах, прывялі суседа. Палажылі яго галава пры галаве з дзедкам і пастралялі. А мне з бабуляй загадалі сесці на лаву і адзін пацэліўся ў нас, але іншы сказаў:

— A na cóż ty tego bachora i starą będziesz bił?

І так мы з бабуляй уцалелі. Цётка стаяла каля швейнай машыны, адзін стрэліў у яе, але не папаў, толькі ногі ад машыны пабіў. І мы вырваліся з хаты: цётка ў свой бок, а я з бабуляй, у адным валёнку і шапцы, пад лес. Прасядзелі да раніцы ў яме, з якой раней выбралі бульбу. Рана вярнуліся ў вёску, якая была спалена; былі забіты сем вяскоўцаў. Са Шпакоў у СССР выехала дзевятнаццаць сем'яў.

* * *

З Занёў было відаць, што Шпакі гараць. Усе мужчыны выйшлі і глядзелі. Заўважылі, што ад Свірыдаў фурманкі ў Зані едуць і разбегліся кожны ў свой бок.

Найперш разбойнікі свінчо з краю забілі, хацелі рабаваць. Але не ўспелі яго ўзяць і пачалі паліць. Спярша з усходу, а пасля акружылі ўсю вёску. Хто на поўдзень уцякаў, таму ўдалося, а тых, што на поўнач уцякалі, многіх пабілі; адну сям'ю цэлую: бацькоў і дзве дачкі...

Наш дом вялікі быў, жыло ў ім чатыры сям'і: дзве праваслаўныя і дзве мешаныя. Раней з Хаева прыязджалі і паведамлялі польскіх, яле яны нам нічога не сказалі і мы найбольш пацярпелі. Тата прыйшоў дадому і кажа:

— Ужо, дзеці, па нас. Шпакі ўжо гараць, а цяпер прыехалі паліць Зані.

— Уцякайма! — крыкнуў дзядзька.

Сястра з мамай сталі выносіць з дому лён, вопратку, а тата кажа ім:

— Перастаньце, гэта непатрэбна.

І пабег з дзядзькам з хаты. Маміна сястра, з парай дзяцей на руках, устрывожылася:

— Што рабіць! Каторае пакінуць, бо з дваімі не дам рады...

— Не пакідай! — крыкнула мама і памагла ёй захутаць дзяцей, а сястра пабегла з цёткай на поўдзень. Сустрэлі тату, якія вярталіся.

— Куды, тата, ідзеш? — пытае сястра.

— Каня, кароў выпусціць, вопратку ўзяць.

— І я з вамі!

Тата дабытак выпусціў, забраў вопратку, перайшоў вуліцу, а сястра яшчэ асталася. Тату ранілі, а сястра за вярбу хавалася і крычала. Вярбу пастралялі і сястру забілі. І я з мамай уцякала. Мама кудысь пабегла, а я стаю, маму згубіўшы. Вяртаюся дадому, а да мяне нашы польскія суседзі:

— Uciekaj stąd, bo za ciebie to i nas zniszczą!

Я праз вуліцу да таты кінулася, яшчэ ён жыў. Адзін з бандытаў хацеў прыкончыць і мяне, але другі сказаў:

— Przestań już, i tak dwa trupy.

Я ўцякала ракам, бо кулі свісталі — тыя кулі мне боты парвалі. Пераначавалі мы пад стогам. Пасля пажару праз два тыдні жылі мы ў Свірыдах у татавага брата. А ў сакавіку брацік нарадзіўся, бо мама цяжарная была. Наш дабытак увесь згарэў, начамі ваўкі і сабакі збягаліся да вёскі. І так было страшна, што баяліся лямпу запальваць; нават да брацікa не падыходзілі, калі плакаў. Мама пражыла яшчэ чатыры гады і памерла. Спачатку мама нешта на нас атрымлівала, а як памерла, то мы асталіся, абы жыць. Хадзілі па суседніх вёсках хлеба прасіць, то адны дадуць, а іншыя яшчэ і аблаюць.

У Шпаках адзін чалавек у стадоле згарэў, іншага смяротна паранілі. Адзін кравец панёс для кума касцюм, то яго там і забілі. У адной хаце моладзь на вячорკі сабралася і там адну дзяўчыну разбойнікі хацелі згвалтаваць. Яна баранілася, то па ёй стралялі. Але не забілі і яе фурманкаю ў Бельск завезлі, але ўжо не адратавалі. У тую ноч у Шпаках загінула сем чалавек. І раней некалькі вяскоўцаў загінула, м.інш. дваіх немцы да воза прывязалі, а пасля расстралялі.

* * *

За што пацярпелі Зані? Ніхто з Занёў да вайны ў савецкія органы не ўступаў. Прычынаў усяму, мабыць, быў загад Сталіна аб перасяленні; прыходзілі і гаварылі:

— Jedźcie do Stalina.

Спярша рабавалі жывёлу і вопратку, найчасцей кажухі. Раз ад бабулі запатрабавалі кажух, быццам паручніку патрэбны. А ўжо кажухоў у нас не было, то бабуля прынесла стары, якім раней каня накрывалі; каня ўжо таксама не было...

— Taki kożuch dla porucznika!? — крыкнуў рабаўнік.

І так тым кажухом ударыў бабулю, што ёй аж дух заняло. А як ужо амаль усё парабавалі, то яшчэ нават кругі з пліты і швейныя ніткі забралі. І наканец, 2 лютага 1946 года, пабілі. То пасля многія з Занёў масава ў міліцыю і УБ пайшлі, каб адпомсціць. І я, каб меў гады, таксама пайшоў бы.

**Запісаў Аляксандр Вярбіцкі**

**) Варфаламееўская ноч — масавае знішчэнне гугенотаў (пратэстантаў) каталікамі ў Парыжы ўначы на 24 жніўня 1572 года перад святам св. Варфаламея.*

***) ПАС — Пагатове Акцыі Спецыяльнай, кіраўніком якой быў капітан Рамуальд Райс, псеўданім — Буры.*



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Помнік у Шпаках*

## *Крывадушнасць*

*Разнёсся гоман аб Ядвабным,*
*Аб генацыдзе, аб вайне,*
*Аб помсце вырадкаў няшчадных*
*І аб забытай іх віне.*

*І прабачэння просяць босы*
*Нашчадкаў спаленых ахвяр.*
*Злуюцца сведкі, быццам восы,*
*Баяцца паказаць свой твар.*

*Але ў памінах з нетраў часу*
*Не заікнецца ні адзін*
*Аб катах Рамуальда Райса,*
*Забойцах дзетак і жанчын.*

*І не прыпомняць словам грэшным*
*Яго крывавых важакоў,*
*Падпальшчыкаў Чыжоў, Залешан,*
*Збуча, Лазіц, Занёў, Шпакоў.*

*Забойцаў жыхароў тых вёсак,*
*Сялян, дзяўчат і юнакоў.*
*І не ўздыхнуць над страшным лёсам*
*Забітых ПАС-ам** вазакоў.*

*Забілі іх у зверскі спосаб,*
*Бо праваслаўнымі былі,*
*Каб жыхароў суседніх вёсак*
*Прагнаць прэч з роднай іх зямлі.*

*Каб страхам выгнаць іх за межы,*
*Аддаць супольнікам палі,*
*Дамы і пуні, і манежы,*
*Сады і збожжа на раллі.*

*Цяпер бандытам хвалу ўзносяць*
*І пачалі ім гімны пець,*
*І паднялі на п'едэсталы*
*Калісь асуджаных на смерць.*

*І на пліце магілы сціплай,*
*Дзе спяць астаткі фурманоў,*
*Не дазваляюць для патомных*
*Аб ПАС-е ўспомніць пару слоў.*

*Не хочуць, каб іх эпалеты,*
*Ад слова праўды на пліце,*
*Зардзелі кроўю ў зрэнках свету*
*Як асцярога для гасцей.*

*Яшчэ саратнікі бандытаў*
*Знаходзяцца паміж жывых.*
*Патынаю гадоў прыкрыты,*
*Ніхто ўжо не асудзіць іх.*

Дзмітры ШАТЫЛОВІЧ

## Які будзе 2005?

Ужо напрыканцы 2004 года паказалася, што новы год многім жыхарам нашай краіны будзе намнога горшым за мінулы. Медыі паведамілі аб павышэнні цэнаў на электраэнергію, газ, вугаль і будаўнічыя матэрыялы. Вядома, што калі павышаюцца цэны на гэтыя энерганосьбіты, дык адразу павысяцца цэны ўсіх харчовых прадуктаў, а таксама вопраткі ды абутку, бо цяпер усё залежыць ад электраэнергіі. Найбольш адчуюць гэта сяляне, рабочыя ды пенсіянеры, якім і так было вельмі цяжка зводзіць канцы з канцамі.

Многія пенсіянеры, асабліва людзі самотныя і недалужныя, якія атрымліваюць 500-600 зл. пенсіі ў месяц, пішуць заявы, каб прынялі іх у дом спакойнай старасці. Але не так лёгка туды дастацца. Месячнае ўтрыманне пенсіянера каштуе тут 1 200 зл. І калі няма магчымасці даплаціць, дык не прымуць у дом для састарэлых.

Большасць сялян пражываючых на г.зв. Усходняй сцяне і абрабляючых невялікія гаспадаркі не вытрымаюць еўрасаюзных патрабаванняў і будуць вымушаны спыніць гадоўлю кароў і свіней. А прыбыткам ад збожжа, пры такіх умовах як цяпер, не абяспечаць сваіх сем'яў і, магчыма, стануць батракамі ды парабкамі ў памешчыкаў, як было калісьці пры санацыі. Мне здаецца, што нашая ўлада не ўмее кіраваць краінай, як левыя, так і правыя групіроўкі. Яны дбаюць толькі пра сябе і толькі сабе павышаюць зарплаты.

**Мікалай Лук'янюк**

## Камп'ютэры ў Бельскім павеце

*Ва ўправе Бельскага старостава на аднаго працаўніка выпадае ў сярэднім амаль адзін камп'ютэр (дакладна 0,83). Да 2006 года ў павеце прадбачваецца выкананне многіх задач у сферы інфармацыйнага грамадства.*

*Паводле паведамленняў старостава павятовыя ўстановы карыстаюцца Інтэрнэтам праз пасрэдніцтва Польскай тэлекамунікацыі. У знешніх зносінах штораз часцей прымяняецца электронная пошта. Афіцыйны сайт Бельскага павета працуе з 2002 года на платным вонкавым серверы. Апрача адміністрацыйнага зместу старонка нясе турысцкі, прамацыйны і інфармацыйны змест. З гэтай крыніцы можна атрымаць службовыя бланкі і пазнаёміцца са спосабамі афармлення спраў.*

*План мясцовага развіцця Бельскага павета ў галіне будавання інфармацыйнага грамадства прадбачвае разбудову існуючай у ваяводстве каркаснай шырокапалоснай сеткі сувязі шляхам далучэння да яе павятовага цэнтра з далейшым падключэннем шырокапалосных каналаў ва ўсе гміны. Са ствараемай тэлекамунікацыйнай структуры будзе вылучана шырокая сець (WAN) адміністрацыі з паралельным націскам на гарантаванне шырокага і таннага доступу грамадзян да Інтэрнэту. Разам з „Бюлетэнем публічнай інфармацыі Бельскага павета" павятовы сайт станецца бясплатнай часткай ваяводскага партала „Вароты Падляшша"; часткай яго будуць падсістэмы „Электронная ўправа" і „Рэгіянальная інфармацыйная сець".*

**Міхал Мінцэвіч**

# Усе калядуюць




*Пераможцам у абодвух сустрэчах з калядкамі стаў „Рамонак" з Ласінкі*

У час Гайнаўскіх сустрэч з праваслаўнай калядкай, якія адбыліся 14 студзеня ў гарадскім доме культуры, у 30 калектывах выступілі каля 530 калядлнікаў. У конкурсным аглядзе прынялі ўдзел дзеткі і моладзь ад імя школ, праваслаўных прыходаў і гмінных асяродкаў культуры Гайнаўскага павета.

Калі гайнаўскія белліцэісты Барбара Петручук і Марцін Засім пачалі весці на беларускай мове мерапрыемства, дашкольнікі сабраліся ў залах вакол сцэны. Першымі выступілі дзеткі з Самаўрадавага садка н-р 3, якія сталі пераможцамі ў сваёй катэгорыі (чарговыя месцы занялі дашкольнікі з садкоў н-р 1 і 2). школы ў Чыжах і Школы н-р 3 у Гайнаўцы, а на трэцім — дзеткі Падставовай школы ў Арэшкаве і Падставовай школы н-р 2).

Сярод гімназістаў найлепшымі спевакамі аказаліся гайнаўскія вучні Комплексу школ н-р 1 (першае месца), Гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы (другое месца) і Гімназія ў Дубінах (трэцяе месца).

— У час калядавання заўсёды вельмі прыемная атмасфера. Я сёлета калядавала ў Арэшкаве, дзе яшчэ многа моладзі рашылася славіць Хрыста, — паінфармавала белгімназістка Паўліна Чурак.

— У час сённяшняга мерапрыемства можам вучыцца як весці сябе на




*„Знічка" папоўніла свой склад некалькімі мужчынскімі галасамі*

Дзеткі спявалі вельмі адважна, не звяртаючы асаблівай увагі на святло юпітэраў. Свае калядкі папярэджвалі ўступнымі словамі на гутарковай беларускай мове і просьбамі дазволу калядавання. Перад сыходам са сцэны дзеткі віншавалі публіку. Некаторыя наймалодшыя выканаўцы калядавалі ўжо чарговы год і таму годна вялі сябе на сцэне.

Вучні падставовых школ выходзілі на сцэну з большым хваляваннем. Паколькі камісія апрача прыгажосці спеву ацэньвала прэзентацыю вучняў на сцэне, дзеткі задбалі пра арыгінальныя ўборы. Хлопцы падрыхтавалі прыгожыя гвязды, а многія дзяўчаты выступілі з вянкамі на галаве і свечкамі ў руках. За прыгожы спеў і арыгінальную вопратку вучні Комплексу школ н-р 1 у Гайнаўцы занялі першае месца ў катэгорыі падставовых школ (на другім месцы апынуліся вучні Падставовай сцэне, падглядзець, як выступаюць іншыя і крыху павесяліцца, — сказала белгімназістка Анна Грыгарук.

Вельмі высокі ўзровень спеву паказалі вучні сярэдніх школ. Першае месца занялі вучні Комплексу агульнаадукацыйных школ з Гайнаўкі, якія далікатна праспявалі калядкі. „Знічка" з белліцэя выступіла ў пашыраным складзе. Побач дзяўчат, якія яшчэ ў мінулым годзе спявалі ў гімназічным калектыве, выступілі хлопцы. Іх калядкі вельмі спадабаліся публіцы, якая горача ім апладзіравала. Камісія ўзнагародзіла выступленне белліцэістаў другім месцам. Трэцяе месца занялі вучні Комплексу прафесійных школ з Гайнаўкі.

— Мы калядуем, каб захаваць праваслаўную традыцыю. Спяваючы калядкі, можна развіваць музычна і духоўна. Праслаўляючы Бога мы адначасна выклікаем радасць у сэрцах іншых людзей. Былі старэйшыя асобы, якія заплакалі пасля нашага сёлетняга калядавання, — заявіла белліцэістка Юстына Бэбка.

Цікава прэзентаваліся дзеткі і моладзь, якія выступалі ў катэгорыі іншых хораў. Хор „Рамонак" спяваў у сваіх народных уборах і за прыгожае калядаванне быў узнагароджаны першым месцам, другія месцы занялі Гарцэрскі мастацкі калектыў „Лясная гавэнда" з Чыжоў і моладзь, якая займаецца музыкай у Гайнаўскім доме культуры; на трэціх месцах апынуліся сям'я Несцерукоў з Курашава і калектыў „Ручаёк", які займаецца ў Гмінным асяродку культуры ў Дубічах-Царкоўных.

У гэтым годзе многа калядоўшчыкаў выступіла ў катэгорыі прыхадскіх хораў. Найвышэйшую ацэнку камісіі атрымалі дзяўчаты з прыхода ў Чаромсе (камісія ніжэй ацаніла моладзь са Свята-Троіцкага прыхода ў Гайнаўцы і дзетак з прыхода ў Ласінцы; трэція месцы занялі дзеткі са Свята-Троіцкага і Дзімітрыеўскага прыходаў).

— У маёй вёсцы Кнаразы раней хадзіла многа калядлнікаў. Дзяўчаты заходзілі спяваць калядкі ў хаты, а хлопцы з гвяздамі славілі Хрыстовае нараджэнне пад вокнамі. Зараз занікае традыцыя калядавання. Спяваць калядкі прыязджаюць гарадскія ўнукі жыхароў вёсак, — заявіў жыхар Гайнаўкі Лявон Масальскі і пахваліў калядоўшчыкаў з дома культуры.

Усе калектывы атрымалі падарункі. Найлепшым выканаўцам арганізатары, якімі былі Дэканальны інстытут праваслаўнай культуры ў Гайнаўцы і Гайнаўскі аддзел Праваслаўнага брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія (галоўныя арганізатары), уручылі ўзнагароды, якія ўстанавілі прадпрымальнікі і праваслаўныя вернікі, ад якіх у час багаслужэнняў збіраліся ахвяраванні. Разыходзячыся дамоў людзі ўспаміналі вясковыя традыцыі калядавання, якія дзеткі яшчэ захоўваюць у Гайнаўцы. У час Нараджэння Хрыстовага ў горадзе можна было спаткаць маладых калядлнікаў з гвяздамі.

**Паказаць традыцыйнае калядаванне**

Каля 30 груп калядоўшчыкаў выступілі ў час XXVI Павятовых сустрэч калядуючых калектываў, якія 16 студзеня праходзілі ў Гайнаўскім доме культуры. Сярод іх найбольш было беларускіх вясковых калектываў і пераможцаў Гайнаўскіх сустрэч з праваслаўнай калядкай. Побач праваслаўных выканаўцаў, калядкі спявалі некалькі каталіцкіх хораў. Камісія, звяртаючы ўвагу на аўтэнтычнасць калядавання і прыгажосць спеву, адабрала 6 калектываў на Ваяводскі агляд калядуючых калектываў. Пераможцамі сталі вясковыя калядлнікі — „Рамонак", „Чыжавяне, „Арэшкі", „Нараўчанкі", жанчыны з Дабрывады і Камерны хор Каталіцкага прыхода Узвышэння святога крыжа ў Гайнаўцы. У лік вылучаных калядлнікаў не трапілі калектывы, якія паказалі спеў на вельмі высокім мастацкім узроўні, але не захавалі традыцыйных калядак або вопраткі (калядлнікі прыходзілі выключна ў цёплай зімовай вопратцы), на што вялікую ўвагу звяртала камісія. Добра было б, каб у будучыні конкурсныя камісіі абодвух павятовых мерапрыемстваў падрыхтавалі аднолькавыя патрабаванні для выступаючых калядлнікаў.

**Аляксей Мароз**

# Распісаць царкву са шкла

На сустрэчу з Лявонам Тарасэвічам і Ганнай Владарчык, рэжысёрам дакументальнага фільма „Станцыя Валілы — Венецыя”, арганізаваную 18 студзеня ў Цэнтры прамоцыі рэгіёна ў Гайнаўцы прыйшло столькі людзей, што не памесціліся ў зале і частцы прыйшлося стаяць на калідоры ды прыслухоўвацца дыскусіі аб сучасным мастацтве і жыцці беларусаў на Беласточчыне.

Спатканне распачалося з прэзентацыі дакументальнага фільма „Станцыя Валілы — Венецыя”, які ўжо тры гады залежваецца на паліцах Польскага тэлебачання і не можа дачакацца агульнапольскай прэм’еры. Лявон Тарасэвіч жартаваў, што фільм застаецца палкоўнікам па палітычных прычынах. Сродкі на яго выкананне былі атрыманы ў часах, калі тэлебачаннем кіравала правіца, а зараз на яго прэзентацыю мусіць даць згоду левіца. Ганна Владарчык тлумачыла, што зараз тэлебачанне паказвае вельмі мала дакументальных фільмаў прысвечаных культуры. Апасаецца яна, што яе фільм будзе прэзентаваны пасля поўначы, калі нямногія глядзяць тэлебачанне.

Мікола Бушко, які вёў сустрэчу, цікавіўся ўмовамі, у якіх стварайся фільм пра мастака з Валілаў. У ім умела прадстаўлены матывы, якія закраналіся ў папярэднім фільме пра Лявона Тарасэвіча, прэзентаваным некалькі гадоў назад у Гайнаўскім доме культуры. Аднак апошні фільм паказвае больш сталага жывапісца. Манументальныя работы, прэзентаваныя ў Венецыі і іншых міжнародных галерэях, уражваюць знатакоў мастацтва. Звычайных наведвальнікаў галерэй шакіруе спосаб прэзентацыі мастацтва Лявонам Тарасэвічам. Людзі баяцца ўваходзіць на размаляваныя мастаком з Валілаў падлогі, мусяць задзіраць уверх галовы, каб паглядзець на памаляваныя ў незвычайныя палосы столі. Удзельнікі спаткання маглі паглядзець як ствараюцца працы Лявона Тарасэвіча. Натхненне да іх знаходзіць мастак у прыродзе. Матывы чэрпаныя з наваколля Валілаў і арыгінальна прэзентаваныя Лявонам Тарасэвічам зацікавілі крытыкаў мастацтва з розных еўрапейскіх краін. Фільм паказвае цяжкую працу жывапісца, які



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Лявон Тарасэвіч і Ганна Владарчык былі рады спаткацца з гайнавянамі*

мноства разоў замалёўвае раней памаляваныя карціны і сцены, але робіць гэта прадумана. Ганна Владарчык трапна спалучыла ў фільме матывы з работы і прыватнага жыцця мастака з Валілаў. Гадуе ён курэй, пастаянна жыве з прыродай і захапляецца краявідамі.

— Спачатку вырэзваў я ў кары. Сур’ёзна пачаў думаць аб мастацтве ў час вучобы ў Акадэміі прыгожых мастацтваў у Варшаве. Пасля адукацыі ў вышэйшай установе арганізаваны былі выстаўкі маіх прац у варшаўскай галерэі „Фоксаль” і Стакгольме. Маімі работамі зацікавіўся швед і стаў маім спонсарам. Я многа спатыкаўся з мастакамі за мяжой і толькі пасля пачалі цікавіцца маімі работамі ў Польшчы. Аднак я не паддаўся ўздзеянню тадышняга экспрэсіўнага польскага жывапісу і захаваў свой індывідуалізм, — успамінаў Лявон Тарасэвіч, які зараз працуе выкладчыкам у згаданай акадэміі.

У час сустрэчы мастак заявіў, што толькі ў дарослым жыцці зразумеў, якое значэнне мела яго выхаванне сярод некалькіх культур.

— Пражываючы ў 2-3 культурах мастак можа хутчэй даспяваць. Мая беларускасць мае для мяне вялікае значэнне, — сказаў Лявон Тарасэвіч.

Жывапісец расказаў, як будучы варшаўскім студэнтам пачаў дзейнічаць у беларускім асяроддзі.

— З Янам Максімюком пачалі мы рабіць часопіс „Сустрэчы”. Дзейнічаў я ў беларускім руху і Брацтве праваслаўнай моладзі. На рост маёй беларускай свядомасці мелі ўплыў Юрый Туронак, Сакрат Яновіч, Юрый Латышонак і Аляксей Карпюк, які быў сябрам майго бацькі.

Лявон Тарасэвіч закранаў пытанні наконт грамадскай дзейнасці беларусаў пражываючых на Беласточчыне.

— Прыйшоў час, што я пачаў быць палітыкам. У Гарадоцкай гміне беларускі клуб на агульны лік 20 радных увёў у раду 17 асоб. Хапіла ўзяць уладу і не трэба было выступаць за датацыямі. Мы пачалі выдаваць двухмоўны часопіс „Гарадоцкія навіны”, — тлумачыў сабраным Лявон Тарасэвіч. — Каб развіваць беларускасць на Беласточчыне, трэба стварыць сваю эканамічную інфраструктуру.

Пытанні да госця тычыліся таксама яго дадатковых зацікаўленняў. Мастак з дзяцінства цікавіцца арніталогіяй. З’яўляецца ён старшынёй клуба птушкагадоўцаў.

— Зараз я чытаю і вучуся як абсталёўваюцца цэрквы. Хацеў бы запраектаваць царкву са шкла і распісаць яе, — заявіў у канцы спаткання мастак. — Зрабіў я праект касцёла для прыхода ў Італіі, але хіба не будзе ён прыняты, бо атрымаўся вельмі каляровым. **(ам-з)**

# *Сустрэча ў семінарыстаў*

*На пачатку снежня Віталь Воранаў даслаў мне паведамленне, што Беларускі культурна-асветніцкі цэнтр у Познані і студэнты-клерыкі, родам з Беларусі, запрашаюць на перадкалядную вячэру. Сустрэча адбылася ў асяродку Каталіцкай місіі 11 снежня 2004 г. познім вечарам. Госці, у большасці студэнткі і студэнты познаньскіх вучэльняў, родам таксама пераважна з Беларусі. Праграма сустрэчы прадугледжвала прывітанне гасцей, малітву ў капліцы, вігілійную вячэру, спевы калядак. Трэба сказаць, што настрой спаткання ад самага прывітання быў шчыра сяброўскі. Калі мы раcпрануліся і прывіталіся, гаспадары-семінарысты прапанавалі экскурсію па залах будынка. У кожнай чарговай зале знаёмілі прысутных з асаблівасцю пабачаных рэчаў. Напрыклад, у Кардынальскай зале — названай так, бадай, у гонар заснавальніка цэнтра — знаходзілася зашклёная шафа з кардынальскім вялікім, чорным капелюшом і цэлым уборам. На сценах — так як і ў большасці залаў на ўсіх паверхах — абразы, у некаторых скульптурныя творы і іншыя элементы рэлігійнага культу. У калідорах на сталах пад шклом сотні здымкаў місіянераў, памяткі з розных краін і кантынентаў (напрыклад, маскі, фігуркі з Афрыкі і г.д.). Таксама ўнутры будынка дзве капліцы, якія мы таксама наведалі. У меншай затрымаліся на малітву. Адзін семінарыст, у час малітвы а таксама і ў час калядак, іграў на гітары і прыгожа спяваў.*

*Пасля малітвы мы ўвайшлі ў залу, дзе падрыхтаваны быў для нас застаўлены піражным і фруктамі стол. Былі кава і гарбата. Тут мы ўжо знаёміліся між сабой, дзяліліся аблаткамі, жадалі сабе добрай будучыні, а перш за ўсё вясёлых святаў. За сталом першым узяў голас Віталь Воранаў, ён прачытаў з паэмы Я. Коласа „Новая зямля” раздзел пад загалоўкам „Каляды”. Вядома, як госці, так і гаспадары на гэтай сустрэчы карысталіся беларускай мовай. Маладыя людзі апавядалі пра вігілійныя звычаі ў сваіх сем’ях, якія ў большасці падобныя: сена пад абрусом, варажба, 12 страваў, ну і гульня (асабліва дзяцей) у арэхі ў свята. Усё гэта вязалася з успамінамі і пра розныя святочныя прыгоды. Размоўцы жартавалі. Настрой быў радасны. Гітарыст урэшце пачаў спяванне калядак. Праграма са словамі беларускіх калядак была выкладзена па ўсім стале (шкада, што тэксты былі без нотаў). Выконваліся калядкі не толькі беларускія. Загучала славутая „Ціхая ноч”. Гэтая калядка мае сваю легенду, хаця і праўда пра яе не менш цікавая. Усе лічаць, што яна нямецкага паходжання. А сапраўды музыку да яе напісаў Франц Грубер, для гітары (бо быццам мышы падзіравілі паддувала ў аргане). Гэты кампазітар пахаваны ў мястэчку Галайн (што недалёка Зальцбурга ў Аўстрыі) бліз касцёла і там знаходзіцца ягоны музей з мемарыяльнай дошкай.*

*Наша сустрэча трывала амаль да поўначы. Развіталіся мы як сапраўдныя сябры, шчырымі словамі: „Добра, што ты ёсць”.*

***Анатоль Маўчун***

# *Менш дыму*

Прадпрыемства цеплавой энергетыкі (ПЦЭ) у Гайнаўцы эксплуатуе пяць кацельняў, якія на працягу года спальваюць 5 910 тон вугалю і 202 тоны топачнага мазуту. ПЦЭ будуе новую сецьпа вул. Пілсудскага (ранейшы трубапровад мае ўжо 30 гадоў). З кацельняй „Фурнэла” трубаправод праклалі да дзевяці шматкватэрных будынкаў. Пабудова яго абышлася коштам 600 тысяч зл. У 2005-2007 гадах ПЦЭ пабудуе яшчэ 1 200 метраў цеплавой сеці. Гэтая інвестыцыя будзе каштаваць 1 млн 300 тысяч злотых.

Горад купляе цеплавую энергію ад гайнаўскай фірмы „Фурнэл”, якая мае вялікую кацельню. Гораду спатрэбіцца гэтай энергіі яшчэ больш. Таму падчас кастрычніцкай сесіі Рады горада радныя разгледзелі магчымасць разбудовы „Фурнэлавай” цеплацэнтралі, каб павялічыць яе вытворчую магутнасць сама менш на 20 працэнтаў. Дазволіла б гэта на ліквідацыю малых пасёлкавых кацельняў, між іншым, па вул. Ліпавай. **(мох)**

# *З ГСам лягчэй*

У Нараўцы не разваліўся і надалей дзейнічае гмінны кааператыў — ГС. Нараўчанская ГС мае каля 20 крамаў па ўсёй гміне. У кожнай большай вёсцы знаходзіцца гээсаўская прадуктовая крама.

Сяляне Нараўчанскай гміны могуць купляць тавары і ў аб’язных гандляроў, але восенню і зімою ахвотна ідуць у мясцовыя кааператыўныя крамы, бо тут цёпла, утульна і прадаюць якасныя прадукты.

Нараўчанская ГС дае шмат каму працу, што немалаважна цяпер у вёсцы. Прадаўцы зарабляюць нямнога, але яны задаволены тым, што кааператыў аплачвае за іх складчыны ЗУС.

ГСам цяпер нялёгка, бо з’явілася прыватная гандлёвая канкурэнцыя, але прыклад Нараўкі паказвае, што можна выжыць.

Зменшылася выразна колькасць працаўнікоў управы кааператыва. Толькі некалькі чалавек працуе цяпер у гээсаўскім бюро, якім умела зараз кіруе Марыя Янюк.

**Мікалай Варанецкі**

# *Дух Леніна*

Скажу коратка: калі дух Леніна надалей лунае над Расіяй, дык дабра і справядлівасці там не чакаць. Калі ягоныя мошчы-мумія ў маўзалеі ў пашане, калі штодзённа ідуць туды сотні наведвальнікаў, ускладваючы кветкі перад гэтым трупам, дык гэта апошняя дурнота і пакланенне д’яблу. Папраўдзе мошчы Леніна нявартыя зямліцы, а толькі пустаты і рускія павінны расправіцца са сваім богам так, як калісь цары з двума мяцежнікамі: Сценькам Разіным і Емяльянам Пугачовым. Іх трупы спалілі, а попел выстралілі з гарматы і след ад іх не астаўся. А Ленін гэта разбойнік усіх вякоў і ягонае месца выключна ў пекле.

**Мікалай Панфілюк**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК




*Беластоцкія гімназісты з настаўніцай Алінай Ваўранюк*

# Свет без музыкі быў бы нудотны

Напярэдадні зімовых канікулаў „Зорка” наведала сяброў у беластоцкай гімназіі н-р 7. Моладзь рыхтуе музычна-паэтычны мантаж прымеркаваны да Свята 25 Сакавіка. Дзяўчаты і хлопцы расказалі пра свой любімы гурт. Уражвае разнавіднасць стыляў, а таксама веданне беларускай музычнай сцэны. Паслухайма.

**Пятрусь Стэльмашук:** Мае любімыя гурты гэта „Rammstein”, „Helloween”, „Scorpions” і „Н.Р.М.”. Яшчэ люблю „Кардон” — шкада, што ён ужо не выступае. Кожны з названых гуртоў цаню за тэкст і музыку. Яны спяваюць пра каханне, жанчыну, волю і пра найважнейшае — пра свой край!

**Магда Карчэўская** і **Наталля Філіманюк:** Мы любім кожны від музыкі, найбольш дыска-пола як „Linkin Park & Yaj-Z”. Калі мы слухаем гэтую музыку, адчуваем, што жывём. Гэтыя песні ніколі не рассейваюць нудоты.

**Эмілія Сэвастыянік:** Я люблю музыку на польскай, беларускай, англійскай і рускай мовах. У хаце слухаю гуртоў: „Рукі ўверх”, „Вірус”, „Л’юбэ”, „Чарамшына”. Іх песні вясёлыя, жывыя, яны ўмеюць перамяніць дрэнны настрой.

**Мая Більмін:** Мой любімы беларускі калектыў гэта „Хлопцы-рыбалоўцы” — яны з маёй роднай вёскі. Аднак найахвотней я слухаю гурты, якія спяваюць на англійскай і польскай мовах.

**Ева Сегень:** Я слухаю гуртоў на розных мовах. Люблю „Чарамшыну”. Слухаю свойскае дыска-пола як: „Ас”, „Прымакі”, „Кошыкі”. Зараз я пачала слухаць песні гурту „Ріма” ды рускамоўныя гурты — „Рукі ўверх” і „Вірус”. Слухаю радыё, дзе найбольш англійскіх і польскіх гуртоў.

**Аня Яканюк:** Найбольш мне падабаецца „Н.Р.М.”. Музыка польскіх выканаўцаў таксама ненайгоршая. У хаце, разам з бацькамі, я слухаю беларускія народныя песні. З сябрамі гіп-гоп і поп-музыку, на дыскатэках мы танчым пад музыку тэхна, а раней — пад дыска-пола.

**Магда Саковіч:** Мне падабаецца „Н.Р.М.”. Люблю яшчэ музыку гіп-гоп і тэхна, асабліва „Groove Coverage”. На дыскатэках я гуляю пры кожнай музыцы, аж да моманту, пакуль не ўпаду на нос!

**Кася Максімюк:** Люблю гурт „Н.Р.М.” і многа іншых. Многа маіх сяброў слухае музыку гіп-гоп і я таксама люблю гэты стыль. Там файныя асобы. Не люблю блюз і ўсяго, што доўжыцца. Скажу так — добрую музыку магу слухаць увесь час.

**Ясміна Абоў-Гілаль:** Найбольш люблю поп-музыку, рэп, рэгг. Люблю песні з рытмам, пры якіх можна танчыць. „Н.Р.М.” ведаю ад нядаўна, мне падабаюцца іх творы. Музыка для мяне вельмі важная, дапамагае ў навуцы. Свет без музыкі быў бы нудотны.

**Міхась Каліна:** Самыя найлепшыя ў свеце гурты гэта: „Ас”, „Прымакі”, „Песняры”, „Хлопцы-рыбалоўцы”. Я люблю і цаню гэтую музыку, бо там магу пачуць сапраўдны дух беларускай песні...

**Наталля Рудчык:** Маім любімым гуртом з’яўляецца „Н.Р.М.”. Іх музыка вельмі патрыятычная. Разумныя тэксты. Я магу ўвесь час слухаць іх песні, яны ніколі не абрыднуць. Я не адважуся параўноўваць іх з нейкім іншым гуртом.

**Міхась Хмялеўскі:** Для мне не мае АСАБЛІВАГА значэння, які жанр музыкі. Я люблю ўсе песні на беларускай мове, бо яны цікавыя. Цаню „Песняроў”, іх музыка жывая і павучальная.

**Наталля Швед:** Мая любімая музыка — беларускі рок. Калі слухаю рок — я адпачываю і адчуваю як у жылах пульсуе кроў. Паводле мяне, найцікавейшы „Н.Р.М.” Лідэр гурту — Лявон Вольскі, першая рок-зорка сярод сусветных рокменаў. Скажу праўду — я нядаўна захапілася рок-музыкай. Маю надзею, што і іншыя сябры ведаюць і любяць „Н.Р.М.” ды таксама захапляюцца іх музыкай!

**Зорка**

# Гарлачык белы

Прыгожая наша зямля! Не дзіва, што нараджаюцца на ёй прыгожыя людзі. Такія, як дачка млынара Адэля. Млын стаяў на беразе нашай ракі, вунь там, дзе цяпер пра яго нагадваюць толькі некалькі гнілых бярвенняў. А быў час, ехалі да млына з усіх навакольных вёсак. Весела грукаталі жорны, імклівыя струмені сцякалі з кола, і людзі казалі, што нават вадзянік дапамагае млынару Богушу. Але найбольш прывозу стала на млыне, калі падрасла млынароўна Адэля. Вось дзе, расказвалі старыя людзі, каралеўна была! Стан, як у бярозкі, вочы ясныя, твар беленькі. Як убярэцца ў сукенку з залатымі галунамі, упрыгожыцца вяночкам — сапраўды, хоць стаў яе на стол пасярод хаты ды кленчы ад замілавання.

Бо нашто такая ганарлівіца ды гультайка яшчэ прыдатная, абгаворвалі прыгажуню вясковыя кабеты. Ні жаць, ні прасці, ні есці зварыць. Толькі любавацца на яе і застаецца.

Але многія хлопцы гатовыя былі і на такое — жаніхі так і круціліся ля млына, і як пабачаць сваю красуню — дык слодыч такая, нібыта яна іх ужо і мёдам пачаставала, і блінамі з мачанкай. А млынароўна адно што пальле кветкі ў гародчыку, ды і сядзе перад акном, гледзячы ўдалеч.

Усе ведалі, каго яна выглядае. Вядома ж, каралевіча! Убілі ж дзеўцы ў галаву, што яе лёс — жыць у палацы. Вось і чакала, пакуль на галаву яе ўскладуць карону.

Каваль Янка, вядома, мог ускласці на яе залатыя косы толькі вяночак з пяшчотных кветак. Затое быў Янка прыгожы, дужы і працавіты. І толькі такая ганарліўка, як Адэля, магла пагарджаць падобным кавалерам.

І як толькі Янка ні стараўся! Каваў для сваёй каханай скрыні з цудоўнымі ўзорамі, купляў для яе на кірмашы шаўковыя хусткі... Усё дарэмна. Урэшце ў адчаі спытаў хлопец Адэлю, чым ён можа заваяваць яе сэрца. Адэля раўнадушна падняла на каваля свае вялізныя сінія вочы і прамовіла:

— Падорыш мне каралеўскую карону, — пайду за цябе.

Жартачкі — каралеўская карона! Гэта ж не сукенка, не чаравічкі, нават не палац. Замаркоціўся Янка. Зразумеў, што не заваяваць яму красуні. І з’ехаў, ды не проста з’ехаў, а пайшоў на вайну.

Мінуў год, другі... Вось ужо і дзесятак набег. Усе Адэліны равесніцы павыходзілі замуж за простых хлопцаў, хто — шчасліва, хто — меней шчасліва. Ва ўсіх падрасталі дзеткі. Пачалі ўжо пасмейвацца над млынароўнай, што заседзелася ў дзеўках з-за сваёй фанабэрыі.

Але Адэля не надта сябравала з вяскоўцамі. Таму, можа, нічога і не ведала пра плёткі. Гады для яе беглі незаўважна, як вадзяны струмень у коле млына. Усё гэткая ж ганарлівая была яе постаць, і ўсё гэткае ж



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Людміла Рублеўская з вучнямі

гожае аблічча. Яна не заўважала, як старэў бацька, як усё ніжэй згінаўся пад цяжарам мяхоў, не зважала на тое, што амаль перасталі ўздыхаць пад яе вакном хлопцы...

Але вось зашумела вёска, загула: вярнуўся з вайны каваль Янка! Ды не простым жаўнерам



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Ася Коршак з Храбалоў

— а уланам! На кані, шлем з пер’ямі, шабля пры баку... Толькі не было ў Янкі ранейшай весялосці ды яснасці. Мундзір ягоны, хоць і з залатымі галунамі, быў пацёрты, твар учарнеў, нібыта ад дыму, і шнары сведчылі, што Янка не хаваўся за спіны іншых падчас бойкі.

Усе чакалі, што каваль адразу пабяжыць да млынароўны. Дый тая, можа, больш прыхільна паглядзіць на былога кавалера, што вярнуўся такі героем.

Але Янка зачыніўся ў кузні. Цікаўныя бачылі, як ён прыводзіць да ладу занядбаную кавальскую гаспадарку, рыхтуе інструменты. Вось ужо і агонь запалаў, загрукала жалеза... Што Янка там каваў? Чаму кінуўся за працу, ледзь парог роднае хаты пераступіўшы? Ніхто не ведаў.

Але праз два тыдні да млына прыйшоў госць. Высокі плячысты жаўнер у мундзіры трымаў у руках каваную скрыню. Млынароўна, як і дзесяць год таму, моўчкі пазірала праз акно ўдалеч, адкуль мусіць з’явіцца яе цудоўны лёс.

(заканчэнне будзе)

*Людміла Рублеўская*

**Час рыцараў**

## Перац як грошы

Час заглянуць у рыцарскую кухню. У замку — як нам здаецца — гатавалі адны смакоцці. І гэта праўда. Вялікая ўвага адводзілася супам і поліўкам. На стале абавязкова сустрэнем печаную дзічыну. Мяса рыхтавалі на многа спосабаў: вэндзілі, марынавалі, салілі. Ахвотна спажывалі смажанае і печанае мяса. Вялікай папулярнасцю карысталіся таксама паштэты. З салодкасцяў цанілі пшанічныя аладкі з мёдам.

У сярэднявеччы з’явіліся модныя вострыя стравы. Рэцэпты (і ўсякія прыправы) прыходзілі разам з рыцарамі, якія вярталіся з крыжовых паходаў. У кухні сустрэнем цынамон, імбір, кмен, мускатны арэх. Аднак на першым месцы быў чорны перац. Зёрны перцу служылі нават як... грошы.

Бяседы ў замку зацягваліся па некалькі дзён. Вядома, пасля такой бяседы выступалі праблемы са страўнікам. У якасці лякарства лекар раіў спажываць вараную кураціну, салату, рабарбар або цыкорыю. Людзі верылі, што кіслыя і горкія расліны найхутчэй вяртаюць здароўе. **Зорка**

## *Вершы Віктара Шведа*

### *Памылкі Вані ў дадаванні*

*Настаўнік спраўдзіў хатнюю працу:*
*— Як жа ты можаш так памыляцца?*
*Вучань на гэта: — Тут вінаваты*
*Не я, вядома, толькі мой тата.*

*Ён памагаў мне ў гэтай задачы,*
*Мама рашае заўжды іначай.*
*— А кім твой тата, скажы мне, Ваня?*
*— Афіцыянтам у рэстаране.*

### *Пагуляю ў мяч*

*Сын скардзіцца: — Хоць тут плач,*
*Ніяк не вырашу задач.*
*Тата на гэта: — Я не раз*
*Ужо знайшоў табе адказ.*

*— Дык татка родненькі, шукай,*
*Рашай задачы мне, рашай.*
*Пакуль не вырашыш задач,*
*Я, татка, пагуляю ў мяч.*

## Польска-беларуская крыжаванка № 5

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.




**Адказ на крыжаванку н-р 1**: Мора, саква, маг, вір, ара, наказ, гітара, кава, гарт, сад, кампактдыск, ар, танец, насып. Млын, кіт, Ас, атаман, карп, кварта, віза, шар, стан, кадра, малады, ар, гараскоп. Узнагароды — аўтаручкі-карэктары — выйгралі: **Ян Сегень**, **Марцін Стоцкі** з Дубін, **Юліта Кур’яновіч**, **Наталля Іванюк-Саўчук** з Нарвы, **Кшысь Мацкевіч** з Семяноўкі, **Іаанна Трусевіч** з Міклашэва, **Магда Каліноўская** з Забалоччыны, **Якуб Сухадола** з Нараўкі, **Даміініка Каліноўская**, **Кацярына Хлябіч**, **Жанэта Яроцкая** з Гарадка, **Дам’ян Рутчук** і **Мажэна Баршчэўская** з Бельска-Падляшскага, **Юстына Аўласюк** з Гайнаўкі. Віншуем!

№ 5 [30-01-2005]

# Жыць са святымі і героямі

Тры месяцы на навуковай стажыроўцы ў Парыжы прабыў вядомы беларускі гісторык **Уладзімір Канановіч**, сустрэўшы там свае 40-ыя ўгодкі. Адразу пасля вяртання са сталіцы Францыі адбываецца гэтая гутарка для беластоцкай „Нівы”. Уладзімір жартуе, што ён далёка не першы і не апошні беларус, які пабываў у сталіцы еўрапейскай моды і навукі. А першым, паводле гістарычных крыніц, у апошняй трэці XV стагоддзя Францыю наведаў наш слынны зямляк, так званы „Літоўскі Адысей” Аляксандр Солтан з-пад Слоніма — нейкі час ён быў пры двары караля Людовіка XI. Верагодна пасля вяртання на радзіму ён заснаваў славуты Жыровіцкі манастыр.

***— Уладзімір, як складваецца твой шлях у навуцы і што даследуе гістарычная антрапалогія?***

— Спярша я займаўся палітычнай гісторыяй Вялікага княства Літоўскага, сярэднявечнай дыпламатыяй. Ужо пасля адукацыі ў Будапешце паноўму стаў глядзець на гістарычны працэс. З часам узнікла цікавасць да духоўнага свету сярэднявечнага чалавека як рухавіка ранейшай гісторыі, да светагляду тагачаснага грамадства. У гістарычнай антрапалогіі мяне цікавяць гістарычныя формы грамадскага ідэалу. Найперш XIV-XVI стагоддзі — позняе сярэднявечча і рэнесанс. Даводзіцца шмат працаваць з наратыўнымі (апавядальнымі) крыніцамі — хронікамі, мемуарамі, летапісамі, панегірыкамі і г.д.

***— Ці даводзілася спаткаць беларускіх навукоўцаў у Парыжы?***

— Не, але мне казалі, што яны прыязджалі па іншых праграмах. Прыкладам, беларускі гісторык, які тады жыў у Маскве — Алег Бухавец, займаўся працэсамі трансфармацыі беларускай вёскі ў канцы XIX і XX стст. Зразумела, што навукоўцы ў Парыжы з усяго свету. У тым ліку з былога Савецкага Саюза. Мажлівасцей для працы сапраўды багата — вялікая бібліятэка, сваё выдавецтва, інфармацыйны цэнтр.

***— Як выглядала сама стажыроўка?***

— Дзякуючы падтрымцы згаданага Цэнтра я працаваў у групе гістарычнай антрапалогіі сярэднявечнага захаду. Гэта вядомы на ўвесь свет калектыў, лідэрам якога быў знаны гісторык Жак Ле Гоф, цяпер яго ўзначальвае яго вучань Жан-Клод Шміт. Я даследаваў ментальнасць, духоўны свет еўрапейскай арыстакратыі ў позняе сярэднявечча. Было важным знайсці агульнае ў ментальнасці еўрапейскіх элітаў розных краін — ад Італіі і Францыі — да земляў ВКЛ, выявіць, што яднала тагачасныя эліты ў духоўным сэнсе. Перад усім, гэта гераічны ідэал тых часоў. Любое грамадства не можа паўнацэнна існаваць без святых і герояў. Выявілася, што палітычныя эліты тагачаснай Еўропы XV-XVI стст. мелі вельмі блізкія ідэалы — з антычнай гісторыі, з часоў ранняга хрысціянства. Гэтыя героі ядналі эліты. Цікава было прасачыць як фармаваўся культ тагачасных герояў і як ён функцыянаваў.



*Уладзімір Канановіч нарадзіўся ў 1964 годзе ў Клецку. У 1991 г. скончыў гістарычны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, у 1996 г. — Цэнтральнаеўрапейскі універсітэт у Будапешце. З 1994 г. па 2004 г. працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. Кандыдат гістарычных навук. Акрамя беларускай і рускай моў, ведае англійскую, польскую, нямецкую, лацінскую і французскую мовы. Асноўны кірунак доследаў — гістарычная антрапалогія.*

***— Чым розніцца светагляд сярэднявечнага чалавека ад цяперашняга?***

— На маю думку, тагачасны чалавек быў бліжэй да Бога. Ён таксама грашыў, блудзіў, памыляўся, але часцей каяўся і задумваўся пра вечныя каштоўнасці. Па-другое, тагачасны чалавек быў больш эмацыйны. Цяпер жа людзі імкнуцца стрымліваць лепшыя праявы сваёй душы. Часам нават саромяцца сваіх станоўчых эмоцый.

***— Ёсць меркаванне, што Парыж — цэнтр касмапалітызму.***

— Сапраўды гэта так, але ён адначасна і культурны цэнтр свету. Тыя набыткі, якія мае гэты горад, вабяць сюды навукоўцаў і людзей культуры. Для гісторыка — гэта сапраўдная Мекка, мноства навуковых цэнтраў, тая ж Сарбона. Парыж — вялізны мегаполіс, але на дзіва ўтульны і кампактны горад. Вельмі зручнае метро, якое ўражвае высокім тэхнічным роўнем, прыкладам 14-я лінія (Ліёнскі вакзал — Нацыянальная бібліятэка), дзе цягнікі кіруюцца электронікай. У горадзе, дзе такі інтэнсіўны рух, надзвычай чыстае паветра, найперш дзякуючы вылікам колішняга прэфекта Османа. На ўскраінах безумоўна не так чыста. На вуліцах жа хапае бамжоў і жабракоў рознага кшталту з усяго свету. Але ўражанне, што горад можа змясціць усіх. Тэма абмеркавання наплыву замежнікаў у афіцыйных колах табу, але праблема іншаземцаў у грамадстве ёсць.

***— Як выглядае канфесійнае жыццё ў такой стракатасці?***

— Натуральна, што рэлігійнае жыццё надзвычай разнастайнае, розныя канфесіі маюць свае храмы. Свае праваслаўныя прыходы ў сталіцы маюць амаль усе праваслаўныя народы. Я наведваў сабор св. Аляксандра Неўскага, які месціцца на ціхай невялічкай вулачцы, што паблізу Трыумфальнай аркі. Храм быў збудаваны ў сярэдзіне XIX ст. высілкамі тагачаснай расійскай дыпламатычнай місіі. У храме адбываюцца адначасна два набажэнствы — у асноўнай частцы храма на царкоўнаславянскай, а ў крыпце — на французскай. На імшы па-царкоўнаславянску пераважаюць выхадцы з былога Савецкага Саюза, даўнія эмігранты, іх нашчадкі, сустракаў і беларусаў. Адна жанчына, дачка эмігрантаў, якая нарадзілася ўжо ў Парыжы, але гаварыла чыста па-расійску, скардзілася мне на тое, як змяніўся Парыж у горшы бок, наракала на разбэшчанасць моладзі. Маім улюбёным месцам для шпацыру стаў трохкутнік — сабор Парыжскай Богамаці, царква св. Северына і царква св. Жульена. Апошняя лічыцца хіба старэйшай хрысціянскай святыняй Парыжа. Паводле легенды гэты храм наведаў яшчэ ў VI стагоддзі першы хрысціянскі манарх Захаду — кароль франкаў Хлодвіг. Нягледзячы на шматкультурнасць і поліканфесійнасць, хрысціянскія карані адчуваюцца ў назвах вуліц і плошчаў Парыжа.

***— Што, на тваю думку, патрэбна сённяшняй Еўропе?***

— Старому Свету патрэбныя вяртанне да агульных хрысціянскіх каранёў, на якіх угрунтавалася еўрапейская цывілізацыя, вяртанне да сапраўдных герояў, а не тварэнне фальшывых куміраў.

**Гутарыў Уладзімір Хільмановіч**

PS. Адразу пасля вяртання з Парыжа ў Мінск Уладзімір Канановіч быў звольнены з працы. Відаць, „гістарычная навука” Беларусі патрабуе зараз іншых кадраў.

## *Пераможцы!*

*Лаўрэатаў узнагароды „Залатых ключоў” беластоцкай незалежнай (належыць да нарвежскага канцэрна „Orkla”) газеты „Кур’ера Паранната” выбіраюць штогод чытачы гэтага папулярнага дзённіка ў катэгорыях „Культура”, „Грамадская дзейнасць” і „Спорт”, запаўняючы купоны друкаваныя пару тыдняў ды высылаючы свае заявы па электроннай пошце. У гэты раз прыйшло ў газету амаль дваццаць тысяч заяў з вызначэннямі на трыццаць намінаваных асоб.*

*У катэгорыі „Грамадская дзейнасць” найбольш галасоў атрымаў* ***Сакрат Яновіч****, беларускі пісьменнік і дзеяч з Крынак (1 750 галасоў), у „Культуры” —* ***Мікола Бушко****, ініцыятар і арганізатар Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі ў Гайнаўцы (1 770), першым у „Спорце” стаў трэнер „Ягелоніі”* ***Адам Навалка*** *(1 327), а за ім на 21 голас менш — спартсменка родам з Беларусі* ***Надзя Касцючык****.*

*Сакрат Яновіч, звыклы ўжо з важкімі ўзнагародамі, пракаментаваў гонар: „Цяжкае, але хай будзе”.*

*— Я ў кампаніі вельмі годных, вялікіх духам людзей. Аж не верыцца, што аж столькі людзей аддала на мяне свой голас. — І зажартаваў: — Хіба ж ніякай махінацыі не было? (Рэдактар Кляшчэўскі запэўніў, што не было). Мне амаль 70 гадоў, я дзед, а на 15-*



Фота МІХАЛА КОСЦЯ

*Злева: Мікола Бушко, Сакрат Яновіч, Адам Навалка*

*годдзе „ўнука” жадаю, каб ён стаў дарослым. А я сабе пажадаю крыху пабыць на гэтай зямлі, сярод людзей на Падляшшы.*

*Імпрэзай, ужо ў Крынках, Сакрат Яновіч крыху стомлены.*

*Мікола Бушко:*

*— Як кожная ўзнагарода, і гэтая здаецца быць нейкай неспадзейкай, але гэтай я цешуся асабліва. Апынуўся я сярод намінаваных знакамітых асоб, асабліва рады я стаць поруч Сакрата Яновіча. Узнагароду я прымаю як сімвал, як узнагароду не толькі для мяне, але і для тых, хто звязаны з ідэяй царкоўнай музыкі, адчуваю яе як прызнанне для нашай дзейнасці папулярызацыі царкоўнай музыкі, напрамку фестывалю адкрытага для ўсіх, не толькі для праваслаўных, не толькі як малітоўнай справы.* **(лук)**

# Чужы я ўсюды




Выйшаў з друку чацвёрты паэтычны зборнік Дзмітры Шатыловіча, таленавітага беларускага паэта-„белавежца” старэйшага пакалення, члена Саюза польскіх літаратараў і Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кніжка паявілася ў Бібліятэцы Беларускага літаратурнага аб’яднання „Белавежа” ўжо як 48-я па ліку.

Дзмітры Шатыловіч — паэт надта сціплы ў сваёй творчасці, піша не зашмат і таму хацелася б прачытаць амаль усё, што выходзіць з-пад яго пяра. Ды тут крыху статыстыкі. Са складзеных паэтам у друк 62 вершаў у зборніку на 60 старонках паявілася толькі 35 вершаў. Для 27 твораў не знайшлося месца ў зборніку і гэта не таму, што не заслугоўваюць яны на публікацыю, толькі з прычын недахопу фінансавых сродкаў. Мяркую, што паэт поўнасцю заслугоўвае на гэта, каб друкавацца на дзяржаўныя грошы, аднак дакінуў бы ён нешта са сваіх уласных пенсійных грошыкаў, каб толькі ўсе складзеныя ім вершы ўбачылі свет. І сталася так, як бачым, што выйшаў зборнічак надта сціплы.

Пераходзячы да зместу кніжкі хачу звярнуць увагу на надта паэтычны яго загаловак „Вясёлка над імглою”. У параўнанні з папярэднімі зборнікамі паэта няма ўжо яго даўняга юнацкага ўздыму, весялосці, энтузіязму, імкненняў і спадзяванняў. Усё ўжо знікае за імглою, адыходзіць у нябыт. Паэт сцвярджае з сумам:

„Як чужы, я ўжо чуюся ўсюды,
Што хмызняк на старой цаліне.
І ілюзіяй сталі мне годы,
Пражытыя мной, як у сне”.
(*Ілюзія і рэчаіснасць*)

Паэт пачынае ўжо падсумоўвацца ў сваёй паэтычнай творчасці, прысвячаючы шмат сваіх вершаў няўхільнаму людскому праміманню:

„Цягнік бяжыць. Куды? Не знаю.
Нябачны ноччу яго цень.
Бяжыць да пекла, ці да раю,
А я старэю кожны дзень”.
(*Цягнік праміання*)

Задумоўваючыся над сваім лёсам паэт думае таксама і пра лёс іншых людзей, лёс нашай краіны.

„Лідэры розныя нам абяцалі
Шчасце вялікае — капіталізм.
Бізнес знайшлі ў ім яны, што кот сала,
І забыліся пра альтруізм”.
(*Плачуць, бунтуюцца людзі*)

Паэт задумоўваецца таксама і над лёсам беларускага народа. Прысвячае ён вершы прысутным у яго жыцці тром „вусачам”. Першы з іх пабудаваў беларускаму народу „лагер у Картуз-Бярозе” (*Вусач першы*). Другі славуты вусач „стаў дыктатарам і катам, / І без суда гнаў на расстрэл” падняволеныя шматлікія народы, у тым ліку і беларускі народ. Трэці радзімы вусач „гатовы лёгкаю рукой / Перадаць айчыну чужакам” (*Правадыр*) — друкуюцца поўнасцю на гэтай старонцы.

Дзмітры Шатыловіч заглянуў таксама і ў наша слаўнае мінулае ды абрадаваў чытачоў сваім надта цікавым абшырным гістарычным творам „Успаміны Полацкай княгіні Прадславы” — Еўфрасінні Полацкай, ігуменні Полацкага Сафійскага сабора, якую Праваслаўная царква кананізавала ў святыя.

Дзмітры Шатыловіч парадаваў чытачоў у „Вясёлцы над імглою” сваёй паэзіяй з глыбокімі ўзнёслымі думкамі і зместам.

Жадаем паэту далейшых творчых поспехаў, а нашай пісьменніцкай арганізацыі не шкадаваць апошніх грошыкаў на іх публікацыю.

**Віктар Швед**

---

*Дзмітры Шатыловіч*

## *Вусач першы*

***Радзіўся я, калі дзяржавай***
***Стаў кіраваць адзін вусач.***
***Аб ім расходзілася слава,***
***Калі гуляў я з дзецьмі ў квач.***

***Аб ім чытаў я ў школе вершы,***
***Чытанкі пра яго жыццё.***
***Ён быў магутны і найлепшы,***
***Яму я верыў, як дзіцё.***

***Калі памёр ён, то са смуткам,***
***З павязкай чорнай на руцэ***
***З жалобай школаю усюткай***
***Мы развіталісь з ім яшчэ.***

***Пасля аб ім пайшлі ў народзе***
***Сумныя весткі чарадой***
***Пра лагер у Картуз-Бярозе,***
***І аб судзе над Грамадой.***

***Як для захопу ўсёй улады***
***Ён сам зрабіў пераварот,***
***Як раздаваў сваім пасады,***
***Каб мучылі яны народ...***

***І нават светлыя рэкламы***
***Аб ім, што ззяюць прада мной,***
***Усе ім створаныя плямы***
***Не вымажуць з душы маёй.***

## *Вусач другі*

***Другі вусач нахальна, раптам,***
***Пасля кароткіх дзён вайны,***
***Змяніўшы ўміг Еўропы карту,***
***Прыйшоў з усходняй стараны.***

***Яго партрэты днём і ноччу***
***Віселі звонку на дамах,***
***Ягоныя, як сажа, вочы***
***Наводзілі на многіх жах.***

***Аб ім зубрыць казалі вершы,***
***Яго хвалілі ўсе наўкол,***
***Ён, быццам бог, лічыўся першым,***
***І меў, як цар, зямны прастол.***

***Ён стаў дыктатарам і катам,***
***І без суда гнаў на расстрэл.***
***Ссылаў у турмы-казематы***
***Людзей нявінных дэ-юрэ.***

***Стварыў усюды ён гулагі***
***Сваіх там мучыў грамадзян.***
***Дзяржава ўся была, як лагер,***
***Дзе панаваў ён як тыран.***

***З другім такім, як ён, тыранам***
***Ён падружыў на нейкі час,***
***Ды той хітрэйшым быў цыганам***
***І здрадзіў створаны альянс.***

***Вусач дрыжэў ужо ад страху,***
***Як пад сталіцаю яго***
***Палкі варожага вермахту***
***Кідалі бомбы і агонь.***

***Ды после доўгага змагання***
***Яму зноў усміхнуўся лёс:***
***Загінуў здраднік і асану***
***Яму запелі да нябёс.***

***І зноў старэчыя прывіды***
***Яму з’яўляліся, як смерч,***
***І зноў у рукі Немезіды***
***Ён пасылаў людзей на смерць.***

***Аднак яна й яго зманіла,***
***Забрала неўзабаве ў свой рай.***
***І свет меў перадышку на хвіліну,***
***Пакуль не аб’явіўся зноў вусач.***

## *Правадыр*

***Правадыр, як добры дэмагог,***
***Ашукаў усіх людзей наўкол.***
***А яны ўсе выбралі яго,***
***Быць манархам, на святы прастол.***

***Абяцаў іх вызваліць з бяды,***
***Ашуканцаў выгнаць за мяжу,***
***Ад карупцыі ўсіх збавіць назаўжды,***
***З прапаганды вычысціць ілжу.***

***І наіўныя паверылі ў ману,***
***А наіўных большасць у жыцці.***
***І калі ўжо ўладу загарнуў,***
***Нікуды не хоча адысці.***

***Хутка ён сабраў прыхільны зброд,***
***Што яму ён служыць, як рабы,***
***І застрашыў пугаю народ,***
***Абяцанкі ўсе свае забыў.***

***Хоць галечай мучыць ён людзей,***
***Хоць свабоду ўзяў ён у турму,***
***Ён, плебей, жыве як багацей,***
***Як цару паклоны б’юць яму.***

***Ён гатовы лёгкаю рукой***
***Перадаць айчыну чужакам,***
***Дапускаючы насілле і разбой***
***На працаўніках сваіх і смельчаках.***

***Родны сцяг змяніў ён на чужы,***
***І, адкінуўшы спаконны гімн,***
***Роднай мовай ён не даражыць.***
***Бо загнаў яе даўно у каранцін.***

***Ён пускае міліцэйскіх псоў***
***На святкуючых народны дзень,***
***І на плошчах праліваe кроў***
***Пераважна маладых людзей.***

***І дзяржаву ахапіў маразм,***
***І бядвеюць людзі з кожным днём,***
***Чутны ў голасе жалобны спазм,***
***А ён можа шугануць агнём.***

***Ён стварыў сабе такі закон,***
***Каб уладу мець адно ў сваіх руках.***
***Крытыкі не дапускае ён,***
***Пагражае за яе турма і штраф.***

***Але ж улада скончыцца яго***
***І народ асудзіць махляра.***
***Гістарычнай ганьбы батагом***
***Пакарае ён правадыра.***

---

# *Рэха часу*



*У кавярні мастакоў час спыніўся, працягваецца вечнае сёння. Якім жа далёкім здаецца быць свет людской нэндзы, усялякіх няшчасцяў, паднебных катастроф, гоману і галасу. Вось — мастак-сюррэаліст прадстаўляе знаёмым новую сяброўку. Маладая дзяўчына выразна збянтэжана блізкасцю славутасцей мясцовага інтэлекту, усё ж прысутныя спазіраюць на яе ветліва.*

*— Чым займаешся? — пытаецца ў яе паэт-постмадэрніст.*

*— Пакуль што, займаюся выключна чыстым мастацтвам, свабоднай ігрой уяўлення. У апошні час прыняла я ўдзел у конкурсе на адзін верш, маю намер пасвяціць сябе культываванню паэзіі, ствараць.*

*— Чуў я, — перапыніў яе журналіст лакальнага радыё, — што мастацкая творчасць мае сваю крыніцу ў хваробе. Мабыць, таму назіраем так многа пакуты, суму і роспачы ў прадуктах сучаснага мастацтва. Да таго ж хворы мастак, ствараючы твор, не дазваляе запанаваць над сабою сілам дэструкцыі, распаду, нябыту. Мастацтва, значыць, — таксама тэрапія.*

*— А я, менавіта, лічу, — падарваўся з крэсла, перакульваючы яго, паэт-постмадэрніст, — што мастацтва мае сваю крыніцу ў магутнасці чалавечага духу, бярэцца з пачуцця збытку, лішку моцы. — І паставіў крэсла на сваё месца, апусціўся на яго, асцярожна падняўся, зноўку сеў.*

*— Усё гэта — толькі мастакоўскія байкі, — выхіліўся з-за суседняга століка сівавалосы старац з павязкай на левым воку, чырванатвары, ды прамаўляючы выразна паблеклы. — Сённяшняе мастацтва здрадзіла сваёй місіі, а прызначэннем ягоным — усхваляннe красы бацькаўшчыны, узмацнянне сілы, магутнасці народа, а таксама змаганне за новага чалавека, за лепшае заўтра. Тым часам вось што бачым у прадуктах сучаснага мастацтва: нічога існага, шлункі, крэмзолі, пэцканіну. Літаратура нагадвае панос думак, а мастацтва — шляпанне асліным хвастом.*

*— У выказванні майго папярэдняга размоўцы, — сарваўся з крэсла паэт-постмадэрніст, — прыкмячаю рацыянальнае ядро. Размоўца крануў такую важную праблему адносін грамадства да ягонай дзяржавы. Сёння новым бляскам ззяюць ідэі Платона, а нарадзіліся ж яны ў глыбокай старажытнасці. Платон пастуляваў увядзенне дыктатарскага панавання, але мае гэта быць дыктатура разумных людзей, філосафаў. Значыць, грамадства абавязана перадаць уладу ў рукі эліт, адукаваных, асвечаных.*

*— Бачу вачыма ўявы, — перапыніў яго прафесар-пенсіянер, — як бяруцца за чубы філосафы-постмадэрністы з філосафамі-неапазітывістамі, еўраазіяты з ісламістамі. Ніхто ж не вызначыў канчаткова, каторая філасофія найлепшая ды найважнейшая. Маю волю выбраць ужо ж старую дэмакратыю, мабыць, недасканалую, можа і прадажную ды бюракратызаваную, тое партыйнае кіраўніцтва, якое выйгрывае ўсеагульныя выбары, паколькі нічога лепшага як дагэтуль чалавечы род і не выдумаў. Дэмакратыя гэта таксама рознаколернасць свету, багацце разнавіднасці. Таксама тут, у ціхай малой кавярні; хоць і выказваем супрацьлеглыя погляды, усё ж — не сварымся, спалучае нас згода на выказванне думак нам чужых, з якімі мы можам паспорыць.*

*Усталявалася цішыня, якую парушаў даходзячы звонку мастацкай кавярні пануры скрыгіт механізмаў гістарычнай неабходнасці.*

***Ежы Плютовіч***

*У самым нізе герб Івянца, па баках якога выйсці да беларускамоўнай і англамоўнай версій сайта. Мы, зразумела, „пойдзем" па „беларускім" пуці...*

# ivianetschurch.at.tut.by

За савецкім часам Беларусь ператварылася фактычна ў самую атэістычную рэспубліку былога Савецкага Саюза. Колькасць дзеючых храмаў можна было пералічыць па пальцах, людзі хрысцілі дзяцей тайна, а ўголас называлі сябе бязбожнікамі. Калі на нейкай машыне часу можна было б перанесціся гадоў на 20 назад, то кожны з упэўненасцю мог бы сказаць, што ў Беларусі з „опіумам для народа" скончана назаўжды. І сапраўды, хто б тады быў у стане падумаць, што менш чым за два дзесяткі гадоў у беларускай краіне не толькі стануць прыводзіцца ў парадак цудам ацалелыя храмы, але і пачнуць будавацца новыя, зразумела, на падставе ўсё той жа веры. Нешта падобнае адбылося ў мястэчку Івянец Мінскай вобласці.

Калі мы набярэм на сваім камп'ютэры адрас у Інтэрнэце: ivianetschurch.at.tut.by, то выйдзем на цікавую старонку, прысвечаную храму св. Еўфрасінні Полацкай, які некалькі гадоў таму быў адноўлены ў мястэчку.

Першая старонка аформлена ў якасці своеасаблівага калажу, які складаецца з фотаздымка царквы, што размешчаны ў цэнтры, наверсе надпіс, які сведчыць аб прыналежнасці храма да Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы, а паабапал выявы гравюр самой святой Еўфрасінні, майстра, які вырабіў вядомы крыж і чорна-белыя фатаграфіі колішняга, „даатэістычных" часоў будынка культавай установы. У самым нізе герб Івянца, па баках якога выйсці да беларускамоўнай і англамоўнай версій сайта. Мы, зразумела, „пойдзем" па „беларускім" пуці.

Адразу аказваемся на старонцы, якая называецца „Навіны прыхода". Змешчаная там даволі цікавая інфармацыя сведчыць, што нягледзячы на невялічкае мястэчка, рэлігійнае жыццё тут не замінае. Старонка зроблена вельмі дбайна — да кожнага паведамлення далучаны фотаздымкі. Найбольш прыцягваючай увагу падаецца інфармацыя аб наведванні вышэйшай царкоўнай іерархіяй храма, бо размешчаная побач фатаграфія дае цалкавітае ўяўленне аб усёй прыгажосці і велічы будынка.

Рубрыка „Гісторыя царквы" дае кароткі расповед аб будаўніцтве храма і тых перашкодах, якія чынілі яшчэ не адышоўшыя ад атэістычнага ачмурэння ўлады Івянца: „У чэрвені 1994 г. настаяцель царквы а. Віктар звярнуўся ў Івянецкі пасялковы савет з просьбай дазволіць пачаць будоўлю на намоленым месцы. Адказ быў катэгарычна адмоўны. Аднак, маючы надзею і перакананне: *„што ўсё магчыма для таго, хто веруе"* (Мк IX, 23), людзі звярнуліся ў сваіх малітвах да нябеснай заступніцы і апякункі святой маці Еўфрасінні Полацкай, просячы яе дапамогі і святых малітваў перад Усявышнім. І сталася вялікая міласць Божая. 24 жніўня 1994 г. Валожынскі райвыканкам адмяніў рашэнне Івянецкага пассавета і даў дазвол на праектаванне і пабудову царквы на былым месцы".

Неяк ужо сталася ў Беларусі, што рознага кшталту сацыяльнымі клапотамі больш вядомыя прадстаўнікі пратэстанцкіх плыняў. У выпадку з івянецкай царквой па-іншаму. Аб гэтым сведчыць рубрыка „Сацыяльнае служэнне", якая таксама пададзена ў пераліку выйсцяў да старонак сайта. У ёй распавядаецца пра разнастайныя дабрачынныя акцыі, што праводзяцца царквой.

Цікавай ёсць і рубрыка „Кантакты", у якой распрацоўшчыкі сайта распавядаюць пра тых, хто дапамагае адраджаць праваслаўе ў Івянцы і рабіць добрыя справы. Сярод іх, дарэчы, шведскі евангельска-лютэранскі прыход з горада Хоррэд.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Гандбольны мінскі СКА ў той час для беларусаў быў нечым кшталту баскетбольнага каўнаскага „Жальгірысу" для літоўцаў...*

# Беларусь, беларусы...

### Трэцяя хваля

Беларускі мужчынскі гандбол мае некалькі этапаў развіцця. Папулярызавацца ён пачаў яшчэ ў канцы 1950-х гадоў, а чэмпіянаты Беларусі праводзяцца з 1961 г. Найбольшы ўздым прыпаў яшчэ на савецкія 1980-я гады. Гандбольны мінскі СКА ў той час для беларусаў быў нечым кшталту баскетбольнага каўнаскага „Жальгірысу" для літоўцаў. Трэнеру Спартаку Мірановічу ўдалося стварыць клуб, які граміў усіх і ў СССР, і ў свеце. Каманда з тыпова савецкай назвай-абрэвіятурай (СКА — спартовы клуб арміі) была дзейсным чыннікам фармавання праўдзівага беларускага патрыятызму. Ёй ганарыліся, яе любілі, а спартовы комплекс „Уручча", што на ўскрайку Мінска, падчас гандбольных баталій напаўняўся заўзятарамі заўсёды бітком. Вельмі спрыялі ўсяму гэтаму і таленавітыя тэлерэпартажы па-беларуску Сяргея Новікава. Тагачасныя вынікі „армейцаў" сапраўды ўражваюць. Мінскі СКА 6 разоў станавіўся чэмпіёнам СССР, тройчы заваёўваў Кубак еўрапейскіх чэмпіёнаў (1987, 1989, 1990), двойчы Кубак уладальнікаў кубкаў (1983, 1988), аднойчы Суперкубак (1989). Беларусь узгадавала ажно 8 алімпійскіх чэмпіёнаў (Аляксандр Каршакевіч, Юрый Шаўцоў, Георгій Свірыдзэнка, Аляксандр Тучкін, Канстанцін Шараваraў, Андрэй Барбашынскі, Андрэй Мінеўскі, Міхаіл Якімовіч). Калі ўпала „жалезная заслона", практычна ўсе беларускія майстры паспелі пагуляць у заходніх клубах. Зараз бальшыня з іх за мяжой. З „залатога" складу дома толькі Каршакевіч, які дапамагае „неўміручаму" Мірановічу ў працы з нацыянальнай дружынай, Шаравараў — ад нядаўнага часу ён галоўны трэнер беларускай жаночай зборнай і Барбашынскі, які займаецца бізнесам.

Праўда легендарны Спартак Мірановіч здолеў выявіцца крыху ў іншым кірунку — беларусы сталі мацнейшымі ў Еўропе і свеце па пляжным валейболе. Цяпер жа ў галоўную каманду краіны прыйшло „трэцяе пакаленне".

Зараз у Тунісе праходзіць сусветнае першынство з удзелам мацнейшых дружын планеты. Нашая ж зборная ёсць гандбольным серадняком і змушана гуляць у кваліфікацыі да чэмпіянату Старога свету. Разам з беларусамі ў адну з шасці адборавых груп трапілі Венгрыя, Італія і Кіпр. Каб прайсці далей у плей-оф, дастаткова было заняць другое месца. Спярша нашыя двойчы саступілі вельмі моцнай венгерскай дружыне (не дзіва — мадзьяры былі паўфіналістамі нядаўняй афінскай алімпіяды) — 31:38 у гасцях (матч выдаўся звышвыніковым) і 27:33 дома. Момант ісціны выяўляўся ў спаборы з Італіяй. Летась у спрэчцы за выхад у плей-оф чэмпіянату свету італьянцы абышлі нашых, дзякуючы толькі лепшай розніцы мячоў. Цяпер надышоў час рэваншу. На сваёй пляцоўцы беларусы не пакінулі супернікам аніякіх шанцаў — 35:24, а на Апенінах быў зафіксаваны парытэт — 20:20. Лідэрамі нашай дружыны, якая пакрысе набірае моц цяпер ёсць якраз прадстаўнікі „трэцяй хвалі" — „запарожскія казакі" Іван Броўка і Сяргей Гарбок (абодва выступаюць за ўкраінскі ЗТР з горада Запарожжа), Юрый Грамыка, Максім Каршакевіч (сын славутага „Каршака"), Васіль Астроўскі. Напрыканцы двойчы быў разгромлены Кіпр — 41:22 і 36:26.

Цяпер нашых гандбалістаў, якія занялі 2-е месца ў групе, у чэрвені чакае накаўт-раўнд за выхад у фінальную стадыю чэмпіянату Еўропы.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

### *Мара кантрабандыста*

*— Кажуць што ў кантрабандыста слязу не выдушыш. А я вось аднойчы заплакаў, — распачаў свой аповед за куфлем лідскага піва Грышка Гурыловіч з Гродна. Вакол яго, за столікам таннага бара сядзелі пераважна маладыя хлопцы, якія меркавалі, што парушэнне мытнага заканадаўства адразу двух суседніх краін для іх справа часовая. Што жыццё іх хутка наладзіцца і будуць яны заможнымі і паважанымі людзьмі. Скуль яны маглі ведаць, што занятак кантрабанднай справай захапляе чалавека мацней і хутчэй, чым гарэлка савецкага калгасніка. Ды і спадзевы на тое, што ў жыцці нешта зменіцца — юнацкая наіўнасць не падмацаваная аніводным рэальным фактам. А Грышка сярод іх адчуваў сябе як ветэран вайны на піянерскім сходзе. Яму, на п'яную галаву, вельмі хацелася штосьці расказаць гэтым смаркатым навічкам, падзяліцца з імі чымсьці набалеўшым, сентыментальным.*

*— Былі, хлопцы, і такія часы, — задумліва апавядаў Гурыловіч, — калі ні кантрабандыстаў, ні бізнесоўцаў у нас не было ўвогуле. Пры саветах нельга было ні багацець, ні мяжу перасякаць. Адкуль таму кантрабандысту ўзяцца. Нават дзяцей хрысціць забаранялася. І гэта найбольш мяне абурала. Вось і пайшоў я тады на мітынгі. Бел-чырвона-белы сцяг захаваў да цяперашняга часу. Мяне ў палітычных колах тагачаснай апазіцыі вельмі паважалі. Але я больш паважаў уласную свабоду, і аніякая палітычная кар'ера мяне не вабіла. Лезці з галавой у той асяродак, дзе людзей называюць электаратам — ніколі не збіраўся. Таму як перамаглі мы саветаў...*

*Ну дык вось. Як толькі з беларускіх грошай знік профіль Леніна, я кінуў палітычныя замарочкі і стаў думаць чым мне заняцца. Вырашыў стаць чэсным, сумленным бізнесоўцам. І так я захапіўся гэтай ідэяй, што не мог спаць. Мая мара пра будучыню, дзе я паважаны грамадзянін, які сваёй працай зрабіў сабе дабрабыт і плацячы падаткі забяспечыў нармальнае існаванне іншым, не давала мне пакою. Але дзе ўзяць першапачатковы капітал? Хоць маё фінансавае становішча было не такім безнадзейным як эканоміка Рэспублікі Беларусь, грошай каб адчыніць якую сур'ёзную справу ўсё адно не хапала.*

*Мяне не вабіў шлях былых сакратароў камсамола і парторгаў, якія адразу перафарбаваліся ў дэмакратаў і карыстаючыся былымі наменклатурнымі сувязямі пачалі прыватызаваць усё, што не паспелі схапіць іх камуністычныя кіраўнікі. Абдзёрлі гэты народ яшчэ мацней, чым калі былі пры ўладзе. Я шукаў адносна чэсныя шляхі набыцця грошай. Каб нічога не красці, нікога не крыўдзіць. Так і стаў кантрабандыстам. Гэта сапраўды быў аптымальны варыянт. Мытнае заканадаўства тады, што ў Польшчы, што ў Беларусі, мянялася хутчэй, чым ты мог яго прачытаць. Тое што можна везці праз мяжу сёння, заўтра і ўчора забаранялася. А ў грамадстве закупку нечага там у нас і продаж яго за мяжой не асуджаліся, нават каб ты гандляваў танкамі. Вольная трактоўка мытнага заканадаўства ў той час нават падабалася людзям. І як яго было трактаваць па-іншаму, калі так з ім абыходзілася сама дзяржава. То сёння нечага нельга ўвозіць, то заўтра гэтае ж нельга вывозіць.*

*Гаворачы карацей, пачалі з'яўляцца першыя грошы. Гэта яшчэ больш надавала мне сіл ды аптымізму. Я амаль не спаў. Працаваў дзень і ноч. А ў перапынках на адпачынак будаваў планы пра адкрыццё сваёй справы.*

*І вось аднаго дня я зразумеў, што мая мара набліжаецца да моманту рэалізацыі. Грошы на нейкі дробны бізнес ужо былі. І планы былі. Мяркую, з'езджу ў свой апошні кантрабандны паход, і хопіць з мяне. Пачну займацца выплатай сваёй дзяржаве падаткаў.*

*Гэты дзень памятаю як сёння. Чаргі на мяжы не было, мытнікі ні да чаго не прыдзіраліся. Мяжу пераехаў надзвычай удала. Развітаўся з бел-чырвона-белым беларускім сцягам, які ў той час лунаў на мяжы, бо быў дзяржаўным, прывітаўся з бела-чырвоным польскім, і паехаў прадаць тавар. І ўсяго два тыдні адсутнічаў. А тут столькі зменаў. Рэферэндум, палітычныя змаганні... Адным словам тое, ад чаго я адышоў каб рабіць бізнес. І вяртаючыся дахаты, на той жа мяжы ўбачыў, што ў нас ужо іншы дзяржаўны сцяг. Гэта значыць і іншы падыход да ўсяго. Зразумеў, што прыйдуць новыя-старыя выканаўцы дзяржаўнай палітыкі, якія будуць гуртаваць людзей вакол калгасаў і дзяржаўных прадпрыемстваў. А людзі ўсё жыццё будуць марыць уцячы адтуль, будучы пры гэтым там дастаткова шчаслівымі. І што будзе зусім іншы бізнес, дзе з маёй марай няма месца. Сеў я на капот машыны і заплакаў. Першы раз у жыцці. Заплакаў па сваёй мары.*

*— Сумны аповед у цябе атрымаўся, — заўважыў хтосьці з маладых як Гурыловіч замоўк. — Пасля такога неяк не хочацца быць кантрабандыстам.*

*— А ты і не будзь. А то гэта на ўсё жыццё, — уздыхнуў Грышка накіраваўшыся на выхад з невялічкага гродзенскага бара. Пасля павярнуўся да анямелай кампаніі і дадаў. — Прывыклі вы да вясёлых аповедаў ад мяне. А ў жыцці кантрабандыста здараюцца і сумныя гісторыі.*

***Сымон Нальшанскі***

# Памяць

Цёпла ўспамінаю тых, якія даўно адышлі ад нас. Хаця не ўсе яны паводзілі сябе прыстойна, бо здаралася пачуць ад іх грубыя словы, насмешкі... Мо таму так было, што іхняе жыццё не было вылажана ружамі, не хапала адукацыі і культуры. Аднак калісь былі і адзінкі, што мелі г.зв. Божы страх, а Біблія была іхнім галоўным аўтарытэтам і праваднікам у жыцці.

Я хадзіў бадай у пяты клас, калі ў Дубічах адзін чалавек з Грабаўца — Ян Васілюк — ставіў хату сваёму ўнуку Жоржыку Гілю і дачцэ сваёй Зінаідзе. Яна яшчэ да вайны выйшла замуж за нашага чалавека, якога ў час савецкай акупацыі нашы „дабрачынныя" дэпутаты адправілі ў пачатку 1941 года ў савецкую армію, адкуль ён ужо не вярнуўся, бо недзе ў 1942 годзе загінуў пад Масквой. Засталася яна з двойкай дзяцей: згаданым старэйшым Жоржыкам і маленькім Паўлам. Выхавала яна іх на старанных людзей. Павел, мой першы найлепшы сябра, атрымаўшы пачатковую адукацыю, пайшоў у вайсковую музычную школу, якую паспяхова закончыў і служыў у ваенным аркестры; сёння ён на заслужанай пенсіі, жыве на поўдні Польшчы.

Цётцы Зінаідзе сёння 93 гады, яна добра чуецца, бо — як кажа — пастаянны рух і праца з'яўляюцца найлепшым лякарствам і сродкам даўгавечнасці.

Згаданы Ян Васілюк меў залатыя рукі і сам умеў усё зрабіць: ставіць хаты, хлявы, стадолы, выраблць сталярку, стаўляць печы, а нават выраблць цэглы. Гэта адно, а другое: Ян пастаянна чытаў Біблію, добра ў ёй разбіраўся і мог нават тлумачыць прароцтвы. Пасля вайны да яго чапляліся партыйныя ўлады, але — так як калісь быў гаварыў мой бацька: „з мужыка мяне не скінуць" — так і дзядзька Ян не вельмі баяўся партыйных пагроз. Аднойчы ў ягоную хату ў Грабаўцы завіталі дырэктар мясцовай школы з міліцыянерам, але, апрача старой Біблії на стале, нічога больш не знайшлі. Дырэктар папрасіў Яна, каб пазычыў яму Біблію для пачытання. Вяртаючы кнігу ўладальніку ён сказаў:

— Нічога я ў гэтай кнізе не зразумеў.

— Бо табе гэта не дадзена, хаця ты і вучаны, — адказаў Ян.

Так яно і ёсць, бо каб зразумець Біблію, трэба паверыць у жывога Бога. А сёння людзі, асабліва моладзь, у што вераць? У шкляны ідал на стале і ў камп'ютэр, дзе пераважна д'ябальскія сцэны, гвалт, злачынствы, грабяжы...

Цёпла ўспамінаю і Кандрата Бандарука з Руткі, бацьку слаўнай Ганны, які таксама ўмеў тлумачыць Біблію і прапаведаваць. І я таксама быў чуў ад яго, што камунізм разваліцца як пыл, што Германія аб'яднаецца і будзе адной дзяржавай, што Кітай абгоніць усе краіны і гэтага трэба апасацца. „Калі прыйдзе кітаец, тады будзе свету канец", — гаварыў ён; невядома — верыць гэтаму ці не... У адрозненне ад Яна Васілюка, які меў залатыя рукі, Кандрат не ўмеў нават калка зацясаць.

Шкада такіх людзей. Яны адышлі ад нас, але памяць пра іх асталася жывая. Сёння такіх не сустракаецца, мо таму, што маладыя лічаць сябе надта вучанымі і разумнымі. Ім Біблія не бывае аўтарытэтам і праваднікам у жыцці. А шкада.

**Мікалай Панфілюк**

# Стаўлю на экалогію



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

У Чаромхаўскай гміне зарэгістраваны дзве гаспадаркі з сертыфікатам экалагічнага гаспадарання. Уладальнікам адной з іх з'яўляецца **Мікалай Саевіч**.

У Чаромху перасяліўся ён з Войнаўкі ў 1975 годзе. Чатырнаццацігектарная бацькавая гаспадарка аказалася цеснаватай для шасцярых братоў. Мікалай рашыў сам пахадайнічаць за сваім лёсам.

— Зямля ў нас малаўраджайная, — канстатуе суразмоўца. — Лепшае поле вылучылі сельскагаспадарчаму кааператыву. Гаспадарам пакінулі палоскі пятага ды шостага класаў. Ды і на гэтых лясная звярына руйнавала пасевы.

На працу Мікалай уладкаваўся ў Гміннай управе. Назначылі яго ў сельскагаспадарчую службу. Урад Герка падаў зялёнае святло для землеробства. Упершыню сялянам прызначылі пенсіі. Многія распісвалі гаспадаркі на дзяцей дзеля таго, каб атрымаць сельскагаспадарчую пенсію. Мікалай стаў іхным дарадчыкам (з боку гміны для афармлення неабходных дакументаў). Штодзень выязджаў на вёскі, каб дапамагаць людзям. У гэты час упершыню ў яго свядомасці нарадзілася думка стаць земляробам, прадоўжыць бацькаву традыцыю гаспадарання.

— З дзяцінства захапляўся я натурай, любіў глядзець на лес дыназіраць за прыродай. Запамяталася вось такое: пасля рассеяння ўгнаенняў на сенажаці жабы ставаліся нерухавымі, быццам ашаломленымі. Хімія адмоўна на іх паўплывала. Рашыў затым весці ў будучыні экалагічную гаспадарку.

Мікалай Саевіч пачынаў гаспадарыць з нуля. Спачатку купіў некалькі гектараў поля, затым трактар і неабходныя сельскагаспадарчыя прылады. Абмежаваўся да вырошчвання жыта, аўса, ячменю ды лубіну і грэчкі. Пасля купіў кароў. Малако вазіў на пункт скупкі ў Чаромху-Вёску, паводле чаргі з кузаўцамі. Ад дзвюх кароў прыбытак за малако састаўляў месячную зарплату гміннага чыноўніка.

Апошнія гады трансфармацыі і рыначнай эканомікі адмоўна паўплывалі на працвітанне сельскай гаспадаркі. Земляробаў пакінулі самі сабе. Жывёлагалоўля стала нерэнтабельнай. Мікалай Саевіч прадаў кароў. У яго свядомасці засталася аднак іскрынка надзеі на лепшую будучыню. Ад пачатку лічыўся энтузіястам Еўрасаюза. І не памыліўся.

— Калі я рашыўся прыкупіць поля, — гаворыць Мікалай Саевіч, — дык кузаўцы палічылі мяне хітруном. Казалі, што ўсе еўрасаюзныя даплаты хачу забраць. Я суразмоўцам у адказ раіў пайсці маім следам. Зараз з'яўляюся ўладальнікам 17-гектарнай гаспадаркі. Арандую трыццаць гектараў з дзяржаўнага фонду. Тры гады таму падаў заяву аб рэгістрацыі экалагічнай гаспадаркі. Пакуль такое зрабіў, дык вымушаны быў падаць заяву з распрацаваным 5-гадовым планам рацыянальнай структуры пасеваў. Дапамогу ў афармленні дакументаў атрымаў ад спецыяліста асяродка сельскагаспадарчай кансультацыі.

У мінулым годзе наведаў мяне прадстаўнік з Любліна дзеля кантролю маёй гаспадаркі. Вынік атрымаўся паспяховым. У час размовы з госцем я пачуў, што Падляшскае ваяводства з'яўляецца найбольшым у краіне рэгіёнам у галіне экалагічнай вытворчасці. Сведчыць аб тым, напрыклад, лік бусліных гнёздаў.

— У 2003 годзе пасадзіў я лес на чатырох гектарах поля, — працягвае суразмоўца. — Зараз дачка атрымоўвае даплаты па лесанасаджэннях. Паслаў затым чарговую заяву на 1,8 гектара. Гэта каштоўная справа, якую рэкамендую іншым: аблясяйце слабыя грунты — аплаціцца! Заявы абмяркоўвае надлясніцтва пасля атрымання дакументаў паводле чаргі.

— Што можаце сказаць аб экалагічнай вытворчасці. Якія праблемы вас турбуюць?

— Асноўная праблема ў збыце прадоў. Ад экалагічнага тавару не прыцягвае пакупніка. Таму зараз збожжа залягае ў дамашніх складах. Спадзяюся, што еўрасаюзныя даплаты на экалогію кампенсуюць маю працу.

— На што прызначыце грошы з даплатаў?

— Перад усім на аднаўленне гаспадаркі і жывёлагадоўлі. Задбаю купіць чарговыя гектары і пабольшыць арэал пасеваў.

**Уладзімір Сідарук**

# *Аб мінулым Беластока*

*Нядаўна трапіла мне ў рукі кніга п.з. „Географія Беларусі", (Менск 1993). Належыць яна пяру таленавітага вучонага і палітычнага беларускага дзеяча Аркадзя Смоліча (1891—1938). Смоліч выдаў сваю кнігу ў пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя, а гэта прыблізна 80 гадоў назад.*

*У раздзеле „Надбужанская краіна" (Падлясьсе) на стар. 271-272 напісана пра стары Беласток. Чытаем там: „Беласток — заложаны ў XVI веку, але доўгі час быў нязначнаю вёскаю. Толькі ў XVIII веку, калі пасяліўся гэтман Браніцкі з сваім дваром, Беласток пачаў расьці. У хуткім часе ён трапіў пад Прусію і немцы завялі тут хвабрычную прамысловасьць. Гэтая прамысловасьць яшчэ больш узрасла, калі ў 30-х гадах мінулага веку была зроблена мытная граніца на мяжы Беларусі з Польшчаю. Шмат хвабрыкантаў пераехала тады з Польшчы ў Беласток разам з сваймі хвабрыкамі. Аднак яшчэ ў 1857 г. меў Беласток усяго 14 тыс. насяленьня. За далейшых паўвека вырас ён у 6 разоў. У нашыя часы Беласток самае большае хвабрычнае места Беларусі. У ім больш за 300 хвабрыкаў, на якіх працуе каля 6 тыс. работнікаў; тавараў вырабляецца больш як на 6 міл. руб. Найбольш разьвіта суконна-кортавая прамыловасьць.*

*Кортавых хвабрык 175, прадзільных 50, шэрсцяных каля 20. Апроч таго ў Беластоку ёсьць некалькі гарбарняў, шаўковых, табачных хвабрыкаў, мылаварных заводаў, пільняў, млыноў і г.д.*

*Беластоцкія тканіны адзначаюцца сваёю дзяшовасьцю, шмат іх ідзець на тандэтную адзежу. Над шыцьцём гэтае адзежы ў самым Беластоку працуюць больш за 3 000 краўцоў, ды на белатоцкім-жа матар'яле працуюць найбольш і віленьскія краўцы. Свае вырабы Беласток вывозіў і далёка за межы Беларусі — найбольш у расейскія месты, а нават і заграніцу даўняй Расеі. З Беластоку разыходзяцца чыгункі ў 5-х кірунках і некалькі шосаў. Жыхароў у Беластоку каля 100 тыс. чалавек, паміж якіх найбольш (каля 2/3) жыдоў".*

*У гэтым навукова-папулярным падручніку, якім з'яўляецца „Географія Беларусі" знойдзем цікавыя звесткі і пра іншыя гарады і мястэчкі Беласточчыны.*

**Мікалай Варанецкі**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
**Nakład**: 1 964 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі":** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2005 r. upływa 5 marca 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Выпадак

*Выбегла на дарогу рудая худая сучачка, кінулася пад колы ровара Кастуся. Кастусь ехаў з грыбоў — на рулі боўталася пластмасавае вядзерка, завязанае зверху хусткай. Сёлета абрадзілі лісічкі. Кастусь, саракагадовы кавалер, ведаў грыбныя месцы каля хутара Кацярыны. Бабулю тую добра ведаў — вучыўся з яе наймалодшым сынам у пачатковай школе. Усе старэйшыя дзеці Кацярыны Масол ужо даўно разбегліся па свеце, дажывала з Юркам, але, вось, памёр той нядаўна раптам. Ад рускай гарэлкі. Дык сядзела сама ў хаце, даглядала агародчык і глядзела розныя „мыльныя оперы” ды амерыканскія „сукцэсы”, час ад часу заглядала на суседскі хутар, дзе жыла Марыся, уцёкшы ад паганага мужа, да свае маці, каб спакойна жыць ды выхоўваць дзяцей. Марыся, якая штодзень ездзіла ў мястэчка на працу, і лістаноша былі амаль адзінымі невіртуальнымі істотамі, якіх бачыла Кацярына найчасцей.*

*Кастусь прытармазіў з піскам колаў. Можа, штосьці са старой здарылася, Жабка паведамляе пра бяду, кліча на дапамогу? Злез хлопец з ровара, паставіў яго пад пахілым плотам, зняў дрот з брамкі і з неспакоем пастукаў у напаўрасчыненыя дзверы. Бабуля, дзякуй Богу, не была нядужая, сядзела на канапе ды глядзела фільм. А на стале красаваліся нарэзаныя на талерцы вяндліны ды параваў вялікі імбрык з гарбатай.*

*— Само села перакусіць. О, як добра — госць у дом! — падхапілася з канапы Кацярына і расставіла гасцінна свае пульхныя рукі. — Сядай, хлопча. Як там у цябе справы маюцца? Можа, кілішачак? Бачу, празяб на тых грыбах... Цяжка вам, хлопцы, жывецца. Мы хоць тую амэрытуру маем, можна сабе на штосьці дазволіць. Нарабіліся за ўсё жыццё панству...*

*— Праўда, цяжка, — ахвотна пацвердзіў Кастусь. — І так цяжка аднаму... Управішся, і лупішся на тэлік. Да таго жывое бабы не ўбачыш у вёсцы.*

*— А я жывая! — засмяялася белымі зубамі Кацярына. — І каб ты ведаў, як цяжка. Мой Толік ужо як дваццаць год памёршы... Калі б дзе які ўдавец... Ды мы ўсе, бабы, іх паперажывалі. От, старасць... А чалавек жа ж жывы.*

*— Ды якая старасць, цётко Кацю! Вы ж такая гладкая, румяная!*

*У гэты раз Кастусь выйшаў ад Кацярыны позняй ноччу. Не ўключаў дынама, каб пасвяціць на дарогу, дык ледзь не стукнуўся з Марысяй, што перла ад станцыі на свой хутар. І стаў госцем частым. Але каб ніхто не бачыў. Бо што за справы можа мець кавалер да старое цёткі? Колькі можна разоў секчы ёй дровы? А Кацярына расквітнела. Урэшце адчула, што гэта значыць быць закаханай. Вярнуліся яе маладыя дні, можа, болей — ночы.*

*Аднойчы пад ранак мчаўся Кастусь дадому. З лясное дарогі выехаў на асфальтавую шашу. А там насупраць, ледзь не лежачы на рулі — Марысьчын былы муж, Паўлюк.*

*— О, то цяпер я ведаю, да каго ты, Косцік, ездзіш! Да мае Марыські! Заб'ю, зараз! Маю доказ! І цябе развалю, і яна ў магілу палезе!*

*І ўрэзаўся сваім веласіпедам Паўлюк у Кастусёвы ровар. А той і пакаціўся. Не ўстаў.*

*Стаіць цяпер на абочыне шашы, дзе загінуў закаханы малады веласіпедыст, крыжык аздоблены вышываным ручніком, і лямпачкі пад ім не гаснуць.*

**Лукаш Правасуд**



Мал. АЛЕГА КАРПОВІЧА

## „Даўціпы” Андрэя Гаўрылюка

Коля наведаў рэстаран:

— Афіцыянт, мне сто грамаў, аркестру па чарцы і табе чарка!

Калі настаў час заплаты, высвятлілася, што Коля не мае грошай і тады афіцыянт выкінуў яго выспяткам са сталовай. На другі дзень Коля, быццам нічога не здарылася, зноў займае месца за сталом таго ж рэстарана і заказвае:

— Мне сто грамаў і аркестру па чарцы!

— А мне то ўжо не? — пытае з'едліва афіцыянт.

— Табе не, бо хуліганіш як вып'еш.

* * *

Матрос вяртаецца з двухгадовага плавання:

— Адкуль узялося гэтае немаўля? — пытае жонку.

— Бо, бачыш, аднойчы наведаў мяне сусед, а я не мела чым яго пачаставаць.

* * *

У час спектакля акцёр, іграючы ролю бацькі, прыцэльваецца з пісталета і кажа:

— Гінь, дрэнны сыне!

Пісталет не выстраліў, але не ўстрывожаны гэтым акцёр-сын падае і шэпча ўміраючым голасам:

— Хаця твой, татка, пісталет не выстраліў, аднак я ўміраю з сыноўскай пакорлівасці.

* * *

Госці агратурысцкай кватэры бачаць, што гаспадар цэлымі днямі праседжвае на пянёчку і пытаюць яго:

— Што вы так робіце?

— Сяджу ды думаю.

— А калі маеце многа часу?

— Таксама сяджу і думаю.

— А калі не маеце часу?

— Тады толькі сяджу.

* * *

Адной жанчыне ксёндз у рамках пакутавання загадаў легчы крыжам перад алтаром. Праз хвіліну выхіляецца са спавядальні:

— Але ж дачанька, чаму ж ты легла на плечы?

— Як саграшыла, так буду і пакутаваць!

# Адгаданка



1. рэзкі, высокі гук, які ўтвараецца рухам паветра праз вузкую адтуліну, 2. установа для захоўвання старых і старадаўніх дакументаў, 3. брат Авеля, 4. выхадная адтуліна канала ствала агнястрэльнай зброі, 5. антонім пераду, 6. тонкі слой ледзяных крышталяў, які ўтвараецца шляхам выпарэнняў на ахаладжанай паверхні, 7. колючая зброя пчол і вос, 8. яўрэй, 9. гісторыка-этнаграфічны рэгіён на захадзе Расійскай Федэрацыі над сярэднім цячэннем Дзясны, у заходняй частцы якога на зломе XIX і XX стст. беларусы складалі больш за 80% насельніцтва, 10. імя актуальнага прэзідэнта ЗША, 11. сталіца Аўстрыі, 12. сталіца Латвіі. **(ш)**

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — народная прыкмета.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 50 нумара**

Дзік, неба, Адам, Хеопс, Ленін, Берн, мат, Унеча, траўма, елка, яда, пакос, куцця, праект.

Рашэнне: **Ікона не дае хлеба, таму не ўсе да яе моляцца.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Міхалу Байко** з Беластока.

# 30.01 – 05.02

**Баран (21.03. — 19.04.)** Шмат энергіі і матывіроўкі да дзеяння, а таксама ўяўлення, каб не падвяргацца непатрэбнай рызыцы. А лёгка можаш памыліцца, захацеўшы праверыць сябе ў новых справах, з якімі будзеш мець дачыненне першы раз. Добры час на светлую любоў. Калі нават пачуцці прыгаслі, змагайся за шчасце. Займіся грамадскімі справамі.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Пазбягай афармлення сур'ёзных спраў, будзеш адчуваць залежнасць ад „укладаў”. Пільнуй працу. Дробныя клопаты. Не распавядай аб сваіх справах. Дбай аб сваю пячонку, не еш тлустай смажаніны.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Старайся не вырашаць важных бізнесавых спраў. Добра было б, каб не трапіліся непаладкі з законам. Не прымяняй эмацыйнага шантажу ў адносінах да каханай асобы. Варта падумаць аб ашчаднасці. Пазбудзься заядлай злосці, якая здаўна ў табе. Энергію, якая цябе распірае, пералі на... паперу.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Дазволь, каб партнёр цябе распешчваў і насіў на руках. Нечаканыя грошы. Можаш карысна купіць, памяняць ці наняць кватэру. Дбай аб пагоду духа.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Адзін жарсны пацалунак можа шмат змяніць. Вялікая нагода, каб прыглядзецца сваім жыццёвым планам, праверыць напрамкі і планы. Знакаміты адпачынак з сябрамі. Грошы ідуць як вада. Меланхолія, невялікі спад энергіі.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Цяжка будзе іншым не паддацца тваёй красе. Досыць сіл, каб справіцца з праблемамі, але лепш крыху прыпыніць тэмп. Можаш разлічваць на праверэных, добрых сяброў. Новыя знаёмыя могуць цябе расчараваць. Нагода памножыць фінансы.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** Цяжка паразумецца з людзьмі, могуць паявіцца непаладкі з партнёрам. Удалыя сустрэчы і ідэі. Можаш памяняць уяўленне аб адным з сяброў, што цябе ўзбударажыць. Могуць азвацца болі ў суставах, асабліва ў каленях.

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** У гэты раз не распусціш усяе зарплаты, хоць можаш купіць вельмі патрэбную рэч, не такую і танную. Зоймуць цябе сямейныя справы, добры кантакт асабліва з далейшымі сваякамі. Агромадная энергія. Хоць праца падганяе цябе пазітыўна, старайся больш адпачываць.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Частыя выезды і афармлянне спраў. Цяжка будзе заспець цябе дома. Шчасце ў каханні гэта не толькі секс. Хтосьці можа папракнуць цябе ў лянівасці, лёгкадумнасці і неадказнасці

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Чакаюць цябе выклікі і пераходныя цяжкасці. Пацяпленне ў пачуццях і больш паразумення ў пастаянных сувязях. Слухай голасу інтуіцыі.

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** Твая кампанейская душа будзе сцірацца з ахвотай пабыць у самоце. Новыя знаёмствы з культурнымі, разумнымі, дасціпнымі людзьмі. Наведай дантыста, нават калі не баляць зубы.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Незаўважна старое сяброўства можа змяніцца гарачымі пачуццямі. Лёгкі спад энергіі, але маеш шанц прабіцца ў важных справах. Прафесійныя поспехі і матэрыяльны дастатак. Шмат якая Рыба выплыве на шырокія воды.

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960